НЕ ЗАДЕРЖИВАЙ ГАЗЕТЫ
Брестская Беларусь" Мозырская 8 Публичной библиотеки

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletariusze wszystkich krajów, łączcie się
Пролетарии всех стран, соединяйтесь

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ (САВЕТАЎ) РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ
ГАЗЕТУ ГАРСЕВЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ПАНЯДЗЕЛАК
20 ліпеня 1931 г.
№ 165 (3254)

Дабіцца рашучага пералому ў здабычы торфу

Пастанова ЦК КП(б)Б і СНКБ аб торфараспрацоўках

Адзначаючы глыбокі прарыў па торфараспрацоўках сыстэмы Белторфаб'яднаньня (выкананьне на 1-VII толькі 21,5 проц. гадовага плану), ЦК КП(б)Б і СНК БССР лічаць асноўнымі і галоўнымі прычынамі гэтага катастрафічнага прарыву—адсутнічаньне патрэбнай увагі здабычы торфу з боку раду парты йных, савецкіх і прафсаюзных арганізацый торфаздабываючых раёнаў, на яўнасьць апартуністычнай недацэнкі палітычнага і эканамічнага значэньня тарфянай праблемы ў БССР, няўменьне хутка і па-баявому арганізаваць справу сыстэматычнага са дню ў дзень падвышэньня здабычы торфу, апартуністычны «самацёк» у вярбоўцы рабочай сілы на торфараспрацоўкі, няўменьне стаць на чале, быць арганізатарам узрастаючай актыўнасьці рабочых, занятых на торфараспрацоўках, недапушчальна слабая работа і няўменьне арганізоўваць торфараспрацоўкі па-новаму большасьці дырэктароў торфазаводаў і мясцовых арганізацый Белторфаб'яднаньня і СНГ БССР.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР канстатуюць, што ня гледзячы на неаднаразовыя дырэктывы партыі і ўраду аб удзяленьні асаблівай увагі забесьпячэньню прамысловасьці і гарадоў апалам, асабліва па торфу, да гэтага часу на торфараспрацоўках працягваюць заставацца такія адмоўныя зьявішчы, як: адсутнічаньне адзінаначаля, жорсткай сыстэмы адказнасьці за плян, гаспадарчага разьліку, наяўнасьць ва ўсіх зьвеньнях тарфянай прамысловасьці абязьлічкі, нізкі ўзровень арганізацыі працы, недапушчалы на марудная скарыстаньне мэханізмаў (30—40 проц.) неўпарадкаваньне сацыялістычных мэтадаў работы, дрэннае бытавое і культурнае абслугоўваньне рабочых,—тармозячыя пасьпяховае выкананьне і перавыкананьне гадовага пляну торфараспрацовак. ЦК КП(б)Б і СНК БССР адзначаюць, што органы НКПрацы і спажыўкаапэрацыі таксама ня ўлічылі асаблівай важнасьці пасьпяховага выкананьня прамфінпляну торфазаводамі—органы НКПрацы не арганізавалі поўнага і камплекснага забясьпечаньня торфазаводу рабсілай, а органы спажывецкай кааперацыі не арганізавалі належнага абслугоўваньня рабочых.

1. Выходзячы з задач сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны і тэхнічнага пераўзбраеньня сельскай гаспадаркі і ўлічваючы складушуюся пагрозу асноўным прадпрыемствам БССР, склаўшаяся становішча з торфаздабываньнем, ЦК КП(б)Б і СНК БССР прапануюць усім ГК і РК КП(б)Б, РВК, Гарсаветам, усім партыйным, савецкім і прафсаюзным арганізацыям торфаздабываючых раёнаў зараз-жа стварыць неабходны пералом у здабычы торфу, мабілізаваўшы усе сілы партыйных, савецкіх і прафсаюзных арганізацый на барацьбу за торф, разгарнуўшы неабходныя мерапрыемствы, якія забясьпечылі-б 100 проц. выкананьне гадовага пляну, паставіўшы барацьбу за 100-проц. выкананьне праграмы торфянай прамысловасьці ў цэнтры сваёй дзейнасьці.

2. СНК асаблівую ўвагу звяртае на абавязковую неабходнасьць выкананьня пляну здабычы і вывазкі торфу ў першую чаргу па АСІНТОРФУ, «ШЛЯХ САЦЫЯЛІЗМУ», СМАЛЯВІЦКІМ, МІХАНАЎСКІМ, БАРЫСАЎСКІМ, балотах, «БАЛЬШАВІКУ», якія зьяўляюцца рашаючымі вучасткамі ня толькі ў паліўным балансе, але і ва ўсім на родна-гаспадарчым пляне Рэспублікі.

3. Улічваючы, што да канца сэзону здабычы торфу застаўся кароткі тэрмін, ЦК КП(б)Б і СНК БССР патрабуюць ад усіх партыйных, савецкіх і прафсаюзных арганізацый баявых тэм паў работы, тібкага канкрэтнага кіраўніцтва і рэальнай з максымальнай эфэктыўнасьцю дапамогі торфараспрацоўкам; асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на самае шырокае разгортваньне фрэзэрнага торфу, які зьяўляецца прасьцейшым і найбольш даступным спосабам здабычы яго, вядучы самую рашучую барацьбу з правямі недапушчальнай коснасьці і супраціўленьня гэтаму спосабу здабычы торфу.

Усклаасьці на сакратароў РК і ГК, старшынь РВК і гарсаветаў УВАРАВІЦКАГА, КРЫЧАЎСКАГА, ШКЛОЎСКАГА, МАГІЛЕЎСКАГА, БАБРУЙСКАГА, СМАЛЯВІЦКАГА, БЫХАЎСКАГА, МЕНСКАГА, ЧАШНІЦКАГА, АРШАНСКАГА і АСІПАВІЦКАГА раёнаў непасрэдны нагляд і адказнасьць за працу торфазаводаў гэтых раёнаў:

4. Прапанаваць усім гаспадарчым аб'яднаньням, дырэктарам прадпрыемстваў, якія спажываюць торф, як апал,—альбо карыстаюцца электра-энэргіяй БелДрэсу, аказваць практычную дапамогу памянёным вышэй торфазаводам, шляхам прадстаўленьня транспарту, пасылкі брыгад, прымацаваньня спэцыялістаў ,рахункових працаўнікоў,эканамістаў, і г. д.

5. Камандываць у Асінторф, «Шлях Социялізму», «Бальшавік», Смалявіцкія, Міханаўскія і Барысаўскія балоты спэцыяльных упаўнаважаных ЦК КП(б)Б і СНК БССР.

Прыняць да ведама заяву т. АМБРАЖУНАСА, што ВСНГ камандыравана на торфараспрацоўкі 18 адказных працаўнікоў прамысловасьці.

6. Прапанаваць Белторфу ў працягу 2-х дзён узмацніць асноўныя торфараспрацоўкі чатырма спэцыялістамі з ліку тэхнічнага апарату трэсту. Адказнасьць за выкананьне гэтага пункту ўскласьці на тав. КАНДАКОВА.

7. Абавязаць Белторф ў працягу 3-х дзён перавесьці ўсе машыны па выра бу торфу на кругласутачную працу, замацаваўшы падоўжаны рабочы дзень. Адказнасьць за выкананьне гэтага пункту ўскласьці на т. Арнта.

8. Белторфу ў працягу 3-х дзён зьлікідаваць абязьлічку машын, паставіўшы на больш буйных распрацоўках (звыш 4-х машын) начальнікаў агрэгатаў, якія кіравалі-б работай ня больш 2-х машын, адказвалі-б за плян, за 100-процантнае скарыстаньне машыны, за свячасовую сушку і ўборку торфу.

9. Абавязаць Белторф забясьпечыць ў працягу 2-х дзён накіраваць з гарадка кога гаспадарчага актыву: на Асінторф—з Віцебску—7 чал., з Воршы—3, з Магілёву—3. На «Шлях Социялізму»—з Гомелю—7 чалавек; на «Бальшавік»—з Гомелю — 5 ч.; на Смалявіцкія і Міханаўскія балоты—з Менску—8 чалавек.

Тав. Арнту скарыстаць гэтых працаўнікоў у якасьці арганізатараў на вучастках, ля машын і г. д. Прапанаваць памянёным старшыням гарсаветаў і РВК мабілізаваць на працягу 3-х дзён 25 рахункових працаўнікоў на 2 месяцы на торфараспрацоўкі: з ВІЦЕБСКУ—5 чал., з МЕНСКУ—7 чал., ГОМЕЛЮ — 5, ВОРШЫ—3, МАГІЛЕВУ—3.

Белторфу скарыстаць гэтых рахункових працаўнікоў для ўвядзеньня гаспадарчага разьліку на вучастках, у цэху, на машыне.

15. Прапанаваць ВСНГ у працягу 5-ні дзён абмеркаваць пытаньне аб перадачы транспарту і функцый на вывазны торфу з балот непасрэдна спажыўцам торфу.

16. Прапанаваць Белторфу: 1) давесьці ў працягу ліпеня вывазку торфу з Асінторфу ня менш, чым па 300 вага нетак у суткі, а ў жніўні давесьці да 400-500; 2) перавесьці цэх рамонту вагнетак на двухзьменную працу; 3) упарадкаваць і мэханізаваць падвозку торфу да магістралёў вузкакалейкі з такім разьлікам, каб падвозка да магістралёў не тармазіла максымальнага скарыстаньня рухавога складу; 4) перакінуць на Асінторф 2-3 лябёдкі адпаведнай моцнасьці для мэханізацыі падвозкі; 5) у працягу 2-х дэкад пусьціць 2 торфазьбіральнелі, скарыстаўшы іх на Асінторфе і «Шляху Сацыялізму»; 6) камандываць спэцыяльных асоб ў Ленінград і Івана-Вазьнясенск для паскарэньня адгрузкі частак торфаразьбіральнелі.

17. ЦСПСБ, НКА, партыйным, савецкім і прафсаюзным арганізацыям торфаздабываючых раёнаў у працягу 3-х дзён распрацаваць практычныя мерапрыемствы па рашучым паляпшэньні культурнага абслугоўваньня рабочых торфараспрацовак.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГЕЙ.
Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД.

Французкія пляны закабаленьня Нямеччыны

БЭРЛІН. 17-VII. «Форвэртс» паведамляе, што французкі ўрад прапануе рэйхсбанку крэдыт на суму ў 500 млн. долараў. Гэты крэдыт павінен спачатку быць атрыманы ад эмісійных банкаў Францыі, Англіі і ПАЗШ, а пасьля гэтага ператвораны ў міжнародную пазыку.

Каб стварыць магчымасьць разьмяшчэньня пазыкі, ад Нямеччыны патрабуюць фінансавых гарантый у адносінах амартызацыі пазыкі і процэнтаў на ёй. Гутарка ідзе аб гарантыі ў форме мытных паступленьняў і даходаў чыгунак Нямеччыны. У сувязі з гэтым плянам, які афіцыяльна будзе запрапанаваны Брюнінгу ў часе яго прабываньня ў Парыжы, там будуць таксама ўзьняты пытаньні аб палітычных адносінах паміж Францыяй і Нямеччынай.

Орган партыі цэнтру «Германія» піша:

«Намаганьні нямецкіх міністраў павінны быць у асноўным накіраваны да таго, каб дасягнуць згоды па фінансавых і эканамічных пытаньнях з тым, каб у Лёндане не адбывалася непажаданае франка-нямецкае адазнаборства».

ПАРЫЖ. 17-VII. Парыскі друк пацьвярджае, што амэрыканскі, ангельскі і французкі эмісійны банкі гатовы прадставіць Нямеччыне крэдыт ў паўмільярда долараў. Гэты крэдыт спачатку кароткатэрміновы будзе затым ператвораны ў доўгатэрміновую пазыку, тэрмінам на 10 год, якая прадастаўляецца Нямеччыне Францыяй, Англіяй, ПАЗШ, Бэльгіяй і Італіяй пад забясьпечаньні нямецкіх мытных даходаў.

Базэльскі банк міжнародных разьлікаў будзе гарантам новай пазыкі. Гарантыйны камітэт 5 дзяржаў атрымае права, адпаведныя прыкладна правом «камітэту даходаў, якія, служаць забясьпечаньнем», каторы існуе ў перыяд дзеяньня пляну Дауэса (гэты камітэт кантраляваў даходы нямецкіх чыгунак).

Паводле заявы друку, «гарантыйным камітэт пяцёх дзяржаў» будзе кантраляваць ня толькі кіраўніцтва мытнымі даходамі. Нямеччына ня будзе мець правабез дазволу камітэту ўтвараць якія-б то ні было крэдытныя і пазыкавыя апэрацыі як унутры краіны, так і заграніцай.

Нямеччына павінна даць абавязацельства па скančэньні гувэрскага мараторыя аднавіць плацяжы па пляну Юнга, які апрымлівае дадатковае забясьпечаньне ў відзе тых-жа мытных даходаў, з захаваньнем прыярытэту (курс) новай пазыкі. Апроч абавязацельства на працягу гэтых 10 год не павялічваць расходаў на ўзбраеньні. Нямеччына павінна даць агульнае абавязацельства свайго роду «палітычнага порамір'я або мараторыя», абяцаўшы нічога не прадпрымаць супроць сучаснага «стапусково» ў Эўропе.

Пазначаныя прапановы трымаюцца ў мамэрандуме, зацьверджаным габінэтам міністраў і складзеным Брынам і Бэртэло ў палітычнай частцы і Фландэнам у фінансавай.

Фінансавы крызіс у Латвіі

РЫГА. 18-VII. Фінансавы крызіс дае сабе адчуваць ва ўсіх галінах гаспадаркі. Рад старых і дробных заводаў спынілі сваю работу. Больш буйныя і магутныя прадпрыемствы выкупаюць свае вэксалі. Пачаўся масавы пратэст вэксалёў. Насельніцтва будучы пазбаўлена магчымасьці атрымліваць сваё зьберажэньні, амаль спынила ўсякія за купкі. Гандлёвыя звароты скарацілися

Расстрэл паліцыяй дэманстрацыі рабочых-изграў у ПАЗШ

НЬЮ-ЁРК. 17-VII. У Кэмпгіле (штат Алабама), ў часе сутычак паміж паліцыяй і нэграмі забіты адзін нэгр і паранена 2 паліцэйскіх. Гэтыя сутычкі адбыліся ў сувязі з паліцэйскім набегам на рад мітынгаў пратэстаў сьмяротнага прыгавару 8 маладых нэграў-рабочых.

Накіроўваючыся да Кэмпгілу, каб разагнаць мітынг, паліцэйскі атрад стрэлам параніў сустрэчанага на дарозе нэгра Грэя. Абараняючыся, Грэй параніў двух паліцэйскіх. Яму ўдалося ўцячы, аднак, пазьней паліцыя зрабіла набег на яго дом і забіла Грэя. У сучасны момант паліцыя пры дапамозе сабак-вывядоўцаў высьлежвае 40 нэграў з ліку ўдзельнікаў мітынгаў пратэсту, супроць прыгавора ў Скатбора.

Ня гледзячы на ўвесь гэты паліцэйскі тэрор, нэгры шматлікіх сельскіх мясцовасьцяй штата Алабама і инш. паўднёвых штатаў, прадоўжваюць дэманстраваць у абарону сьмяротнага Скатбора. Паводле дадатковых вестак «Асашыйэтэд Прэс» з Кэмпгілу пры паліцэйскім набегу на дом нэгра Грэя і яго забойстве былі апроч таго параны 5 нэграў і арыштаваны 30.

Цэнтральнае паліцэйскае кіраўніцтва Кэмпгіла абвясьціла аб мабілізацыі 500 узброеных белых, каб правесьці арышт яшчэ 5 нэграў, у гэтым ліку арганізатараў мітынгу ў Кэмпгіле».

Забастоўка пекараў у Лідзе

ВІЛЬНЯ. «Дзеньнік Віленскі» паведамляе, што ў Лідзе больш тыдню ўжо бастуюць рабочыя ўсіх хлебапякарняў. Прычына забастоўкі зьніжэньне заработку на 25 проц. Рабочыя хлебапёкі ў сваю чаргу высунулі патрабаваньне падвышэньня заработку на 15 проц. У Ліду выехаў прадстаўнік здрадніцкага прафсаюзу спэц па ўгаворваньні і махлярэ па заключэньні да гаворў з прамыслоўцамі. Забастоўка праходзіць вельмі бурна.

Рабочыя іншых прадпрыемстваў заявілі ,што ў выпадку калі патрабаваньні пекараў ня будуць задаволены, абвесьцяць забастоўку салідарнасьці.

За адзіны фронт пралетарскага контр-наступленьня

НЬЮ-ЁРК. 17-VII. Закончылася нацыянальная (агульна-дзяржаўная) канфэрэнцыя адзінага фронту, скліканая нацыянальным саюзам гарнякоў у Пітсбургу. Яна прыняла рашэньне да лейшай арганізацыі адзінага фронту і намецілі формы аб'яднаньня стачачнай барацьбы ў Ілмінойсе, Хэрлене, Кэнтукі і іншых мясцох забастоўкі 40.000 гарнякоў Пэнсільваніі пад адзіным кіраўніцтвам.

Камуністычная «Дэйлі Уоркэр» адзначае, што канфэрэнцыя зьяўляецца важнейшай канфэрэнцыяй гарнякоў, якія калі-небудзь адбываліся ў ПАЗШ. На канфэрэнцыі прысутнічала 683 дэлегаты, прадстаўляючых 101.000 гарнякоў з 8 штатаў. Канфэрэнцыя пераняла весьці барацьбу супроць падрыхтоўваемай імпэрыялістамі вайны і ўдзельнічаць у анты-імпэрыялістычнай дэманстрацыі 1-га жніўня.

Мэталёўцы рыхтуюцца да забастоўкі

ВІЛЬНЯ. «Газэта Варшавска» піша, што на нарадзе паміж прамыслоўцамі і прадстаўнікамі прафэсыянальных саюзаў недасягнута згода аб зьніжэньні заработку рабочым мэталёўцам. Ня гледзячы на ўсе стараньні сацыял-фашыстаў і іх заспакойваючыя зявы, што нібы прамыслоўцы ня рызыкнуць у такі напружаны час на зьніжэньне заработку, прамыслоўцы дамагаюцца зьніжэньня ўсім рабочым заработку на 20 проц.

Сярод рабочых мэталёўнаў панове ва лікае абурэньне. На сходах рабочыя выказваюцца за абвешчаньне забастоўкі.

Біржавыя апэрацыі не адновяцца да канца ліпеня

БЭРЛІН. 18-VII. У банкаўскіх колах мяркуюць, што біржавыя апэрацыі на працягу ліпеня зусім не адновяцца. Амаль бясспрэчна, што нямецкія біржы будуць закрыты і ў панядзелак.

Міжнародная хроніка

⊙ Газэты паўночнага Кітаю паведамляюць, што ў паўночным Кітаі пачаліся ваённыя дзеяньні паміж войскамі Шы-Юй Саня і мукдэнцамі.

⊙ Міністэрства замежных спраў Нанкінскага ўраду паслала Японіі другую ноту адносна кітайскіх пагромаў ў Карэі. Міністэрства заяўляе, што адказ Японіі на першую ноту Нанкіна незадавальняючы. Японія адказна за забойства ў Карэі, і Нанкін паведае за сабой права патрабаваць кампэнсацыі за ўсе панесеныя кітайскімі грамадзянамі страты.

Дадей нота патрабуе пакараньня ўсіх арганізатараў пагромаў і гарантыі непаўтарэньня падобных інцыдэнтаў у будучым. Кітайскія камэрцыйныя арганізацыі прадоўжваюць агітацыю за анты-японскі байкот. Арганізацыя байкоту апітуюць таксама за ўсеагульныя забастоўкі на японскіх прадпрыемствах ў Кітаі.

⊙ Сёньня ўдзень на савецкім параходзе «Рудзутак» выехала ў СССР група ангельскіх вучоных. Паездка арганізавана ангельскім таварыствам культурнага зьбліжэньня з Савецкім Саюзам. У склад групы ўвайшлі 30 выдатных ангельскіх вучоных розных спэцыяльнасьцяй.

⊙ Учора ўвечары адбыўся бурны шматлюдны мітынг пратэсту супроць забароны кнігі Нэйкраеца «Барыкады Вэдынга». Юрысты Апэль і Левэнталь, якім добра вядомы крывавыя падзеі ў раёне Вэдынга давялі радам фактаў нягрунтоўнасьць забароны гэтай кнігі.

Уборачную эстафэту Саветаў — на поўны ХОД

Уборка ўраджаю ўжо распачалася,

яна застала рад раёнаў непадрыхтаванымі

План сенаўборкі выканан толькі на 57,5 проц. Узьняць тэмпы!

Месячнік генэральнай праверкі і ўборачная эстафэта саветаў—моцны сродак мабілізацыі мас на пасьпяховае правядзеньне ўборкі ўраджаю

Неадкладна ўключыцца ў месячнік генэральнай праверкі і ўборачную эстафэту

Паўднёвыя раёны БССР ужо пачалі ўборку ўраджаю. Паводле вестак НКЗему, на 15-га ліпеня 8 раёнаў: Азарыцкі, Брагінскі, Жыткавіцкі, Камарынскі, Мазырскі, Нараўлянскі, Петрыкаўскі і Хойніцкі раёны ўжо пачалі ўборку азімых. Праз некалькі дзён усе раёны БССР пачнуць масавую ўборку ўраджаю.

Першыя весткі з фронту ўборчнай сыгналізуюць аб тым, што рад калгасаў і нават раёнаў уступаюць ва ўборачную кампанію яўна непадрыхтаванымі.

Непадрыхтаванасьць уборачных машын і інвэнтара, дрэнная расстаноўка рабочай і цягавай сілы, адсутнасьць сапраўднай зьдзельшчыны і надежнага вучоту працы ў значнай часткі калгасаў зьяўляюцца буйнейшай перашкодай у разгортваньні ўборчнай і не даюць узяць бальшавіцкіх тэмпаў работы.

Уборка сена на БССР таксама недапушчальна зацягнулася. Паводле вызначаных урадам плянаў, уборка сена павінна была быць скончана да 20-га ліпеня. Тэрмін ужо скончаны. Між тым, плян сенаўборкі паводле друкуемай сёньня зводкі Наркамзему, на 15-га ліпеня выкананы толькі на 57,5 проц.

Заця жка сенаўборкі стварае непасрэдную пагрозу кармовай базе і вельмі дрэнна адаб'ецца на разгортваньні ўборчнай кампаніі. Ёсьць небясьпека таго, што саўгасы, калгасы, ўступіўшы ва ўборачную кампанію, ня здолеюць як належыць скасіць і ўбраць усё сена. Уникнуць такога становішча можна будзе толькі тады, калі ўсе раённыя кіруючыя органы, сельсаветы, калгасы і саўгасы прымуць усе меры, мабілізуюць усе сілы на тое, каб да разгортваньня масавай ўборкі збожжа цалкам скончыць уборку сена.

Разам з гэтым павінна быць зараз-жа разгорнута самая шырокая работа на праверцы падрыхтаванасьці саўгасаў, калгасаў і аднаасобнага сэктару да ўборачнай кампаніі.

Тыя прарывы, якія выяўлены ў паўднёвых раёнах самім ходам уборачнай кампаніі, павінны быць на-хаду выпраўлены. Яны не павінны мець месца ў астатніх раёнах БССР, якія пачнуць уборку ў бліжэйшыя дні.

Абвешчаны «Зьвяздой» сумесна з ЦКК КП(б)Б Наркамвемам і Калгасцэнтрам месячнік генэральнай праверкі разгортваньня ўборчнай кампаніі і ўборачная эстафэта, арганізаваная газэтай «Савецкая Беларусь» — зьяўляюцца праграмай баявых дзеяньняў для раённых і нізавых партыйных і савецкіх арганізацый, для ўсіх саўгасаў, калгасаў, для ўсяго раённага і нізавога друку і для ўсіх рабселькораў.

Неадкладным ўключэньнем у месячнік генэральнай праверкі і ўборачную эстафэту павінны быць узьняты ўсе партыйныя і камсамольскія арганізацыі, ўвесь савецкі актыў, усе калгасьнікі, беднякі — серадняки-аднаасобнікі па выпраўленьне маючыхся прарываў у падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі.

Шырокай праверкай падрыхтаванасьці да ўборкі, ліквідацыяй маючых ся прарываў забясьпечым пасьпяховую ўборку ўраджаю другой бальшавіцкай вясны.

План складзены, а работы няма

У Полацкім раёне слаба разгорнута падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі. Райкалгасасаюз абмежаваўся толькі тым што склаў плян правядзеньня ўборкі ўраджаю і на гэтым супакоіўся. Але як калгасы забясьпечаны ўборачным інвэнтаром і машынамі, як у калгасах пастаўлена арганізацыя і вучот працы райкалгасасаюз забыўся. На запытаньне, што зроблена ў падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі, старшыня райкалгасасаюзу Балноўскі адказвае: «Я нічога вам даць не магу, плян складзен і ўсё».

Плян, складзены Балтоўскім, далей дзьвярэй райкалгасасаюзу ня выйшаў. У большасьці калгасаў пляну на ўборачную кампанію няма. Вытворчыя нарады ў калгасах не праводзяцца. Калгасы не забясьпечаны ўборачнымі машынамі, не хапае жняярак, конных граблёў, касілак, сіласарэзак, лёнамялак і інш. У большасьці калгасаў яшчэ ня ўведзена зьдзельшчына.

Сельсаветы зусім слаба рыхтуюцца да ўборкі ўраджаю. Яны лічаць, што гэта справа не сельсаветаў, а саміх калгасаў.

Да пачатку ўборкі збожжа засталося лічаныя дні, а калі ўборачныя пляны будуць створаны ў калгасах—невядома.

Кіруючыя раённыя арганізацыі павінны зьвярнуць на гэта асаблівую ўвагу. Усе калгасы раёну павінны дружна і падрыхтавана сустрэць уборку ўраджаю.

К. Полацкі.

Першы выйшаў пераможцам

Калгас «Тружанік», Асіпавіцкага раёну, першы ў раёне скончыў сенаўборку. Скошана і ўбрана 52 га сенажаці пры 10 працаздольных касцох. Зараз калгасьнікі дружна і арганізавана выйшлі на дапамогу суседняму калгасу «Інтэрнацыянал», які ганебна адстаў з сенаўборкаю.

Шульман.

ЗВОДКА

аб ходзе касьбы і ўборкі сенажацяй і сеяных траў па сэктарах БССР на 15 ліпеня 1931 г.

Назва сэктароў	Натуральн. сенажац.	Шматгадовыя травы	Разам		
	Проц. вык. да пляну	Проц. вык. да пляну	Скошана	Убрана	Проц. убранага. к скошан
1. Па саўгасам . . .	32,4	106,6	31229	16337	52,3
2. Па калгасам . . .	33,0	106,2	623602	29 623	47,2
3. Па аднаасобнаму . .	25,8	65,4			
Разам	28,9	85,0	654831	301960	47,5
Па Бел. Аддз. Трактарацэнтру	51,3	57,0	—	—	—

Увага: Зводка па калгасах і аднаасобным сэктары складзена паводле даных 69 раёнаў па становішчы на 15-VII-31 г.

Замест ударнай работы па ўборцы сенс—п'яккі і гульні

У калгасе «Чырвоны Партызан» (Сьмілаўскі раён) сенаўборачная кампанія праходзіць злачынна марудныя тэмпамі. Калі і на далей так будзе цягнуцца ,дык сенаўборачная кампанія будзе сарвана. Гэтымі днямі пачнецца ўборка збожжа, а калгас яшчэ зусім не падрыхтоваўся да яе сустрэчы.

Калгас засьмечаны кулацкімі элементамі—ня ўведзена зьдзельшчына. Работа робіцца на вока, зусім адсутнічаюць ударніцтва і сацспаборніцтва. Старшыня калгасу Равека Янка часта ўводзіць у калгасе «сьвяточныя дні», у рэлігійныя сьвяты ніводзін калгасьнік ня выходзіць на работу. У такія дні па ініцыятыве старшыні калгасу робяцца п'яккі. Часам яны цягнуцца цэлымі суткамі. Так, 5 ліпеня старшыня з кампаніяй за адну ноч прапіў 40 руб. калгасных грошай.

Брыгада «Сав. Бел.» Лявіцкі Ягоф, Падаляк Уладзімір.

Новыя калгасы па-ўдарнаму рыхтуюцца да ўборкі

Правільная арганізацыя працы, увядзеньне зьдзельшчыны, ліквідацыя абязьлічкі ў калгасах Рачыцкага раёну далі новы прыліў бяднякоў-серадняцкіх гаспадарак у калгасы.

Так, па Капараўскім сельсавеце да гэтага часу ня было ніводнага калгасу, але зараз аднаасобнікі пераканаліся ў перавазе калектыўнай гаспадаркі і 13 бяднякоў-серадняцкіх гаспадарак в. Будка аб'ядналіся, стварыўшы калгас «Дабраволец». Зараз новы калгас «Дабраволец» налічвае 30 гаспадарак.

Калгас ударна рыхтуецца да ўборкі ўраджаю.

У Баравікоўскім сельсавеце ў в. Аляксандраўка арганізаваны новы калгас «Зорка», у які ўвайшло 9 бяднякоў-серадняцкіх гаспадарак. У калгас «Калектыўная праца» (в. Шарэйка) ўлілося 35 бяднякоў-серадняцкіх гаспадарак.

У Маладушкім сельсавеце ў адказ на замах на забойства настаўніка-арганізатара калгасу тав. Буркоўскага 15 лепшых аднаасобнікаў уступілі ў калгас «Непераможны», заяўляючы: «мы павінны ісьці ў калгасы, каб дапамагчы партыі і савецкай уладзе хутчэй пабудаваць сацыялізм».

Нікмар.

Арганізаваць генэральную праверку выкананьня дырэктыў па падрыхтоўцы да навучальнага году

(Старшыням раённых і гарадзкіх КК-РСІ)

Партыяй і ўрадам пастаўлены задачы ў 1931-32 навучальным годзе пераўтварыць Савецкую Беларусь у краіну супэльнай пісьменнасьці.

Пасьпяховае вырашэньне задач культурнага будаўніцтва немагчыма без мабілізацыі і прыцягненьня да гэтае справы ўсёй пралетарскай грамадзкасьці, без актыўнага ўдзелу (на падставе адзінага культпляну) ўсіх савецкіх, гаспадарчых, прафэсыянальных каапэрацыйных і ўсіх грамадзкіх арганізацый зьверху да нізу, без разгортваньня масавага руху за сацыялістычную культуру — культпаходу, культэстафэты, сустрэчных культпляваў, сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

ЦКК КП(б)Б і НК РСІ прапануе раённым і гарадзкім КК-РСІ ў часе правядзімага НКАсьветы, ЦК ЛКСМБ і ЦП саюзу працасьветы двухдэкаднікі трывогі і на працягу ўсяго нэрыяду падрыхтоўкі да навучальнага году за бясьпечыць сталы кантроль, праверку выкананьня дырэктыў партыі і ўраду і ЦКК-НК РСІ ў галіне культурнага будаўніцтва.

1. Безадкладна арганізаваць генэральную праверку выкананьня дырэктыў ў галіне падрыхтоўкі да навучальнага году (пастанова НК-РСІ ад 19-VI—31 г.) савецкіх, органаў нарасьветы, гаспадарчых, прафэсыянальных, каапэрацыйных арганізацый, у першую чаргу найбольш вузкія вучастакі культурнага будаўніцтва, дзе маюцца глыбокія прарывы, як-то:

а) будаўніцтва і рамонт навучальных устаноў, школ і інтэрнатаў;

б) забясьпечаньне кадрамі, а таксама падручнікамі і навучальнымі прыладамі;

в) забясьпечаньне вучняў сьнеданьнямі, вопраткай і абуткам;

г) становішча работы па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці сярод рабочых і прызыўнікаў 1909 году;

д) падрыхтоўка да ўвядзеньня ўсеагульнага абавязковага палітэхнічнага навучаньня для дарослых працоўных да 45 г. і дзяцей 8-11 год, а таксама пераходу да ўсеагульнага навучаньня на базе 7-гадовае школы;

е) масавага разгортваньня дашкольнага выхаваньня;

ж) перабудовы культпалітасьветработы ў адпаведнасьці задачам сацыялістычнага будаўніцтва.

2. Для правядзеньня праверкі арганізаваць брыгады, правесьці шырокія нарады прадстаўнікоў савецкіх, гаспадарчых, каапэрацыйных, камсамольскіх і інш. арганізацый з прыцягненьнем культактыву — рабочых, калгасьнікаў. На прэзыдыўме заслухаць даклады паасобных арганізацый.

3. Прыняць усе меры для таго, каб у тэрміновым парадку дабіцца ліквідацыі ўсіх прарываў і ўзьняць работу ўсіх арганізацый па падрыхтоўцы да навучальнага году на бальшавіцкія тэмпы, якія-б забясьпечылі пасьпяховае вырашэньне пастаўленых партыяй і ўрадам задач культурнага будаўніцтва на 1931—32 навучальны год.

4. Закончыць двухдэкаднік трывогі падагульваньнем сталых вынікаў ходу падрыхтоўкі і заслухаць даклад райгар штабу культэстафэты. Вынікі і мерапрыемствы даслаць у ЦКК-НК РСІ.

Старшыня ЦКК і НК РСІ
КАЛНІН.

У 13 раёнах пачалася ўборка збожжа

У 13 паўднёвых раёнах БССР на 15-га ліпеня пачалася ўборка збожжа. У Азарыцкім раёне калгасы зжалі 130 га жыта, аднаасобнікі 835.

Брагінскі раён пачаў жніво 13 ліпеня, калгасы зжалі 312 га жыта і 36 га ярыны, аднаасобны сэктар 91 га жыта. Пачалося жніва і ў Жыткавіцкім раёне.

14-га ліпеня пачаў ўборку збожжа Камарынскі раён, калгасы зжалі 310 га, аднаасобнікі 359 га. Пачалося жніва ячменю. У Нараўлянскім раёне калгасы зжалі 123 га жыта і 23 га ярыны, аднаасобнікі 568 га жыта і 15 га ярыны.

У Петрыкоўскім раёне зжата 159 га жыта, у Хойніцкім раёне калгасы ўбралі 72 га, аднаасобнікі 200 га.

Уборка распачата таксама і ў Мазырскім раёне.

Даць Чырвонай арміі клясава-вытрыманага, сьвядомага і пісьменнага прызыўніка-ўдарніка

Па-заўчора пры СНК БССР адбылася нарада прадстаўнікоў ваенкоўскіх грамадзкіх арганізацый па пытаньні аб падрыхтоўцы да чарговага прызыву ў Чырвоную армію.

Выступіўшы з дакладам аб задачах па правядзеньні чарговага прызыву прадстаўнік БВО т. Егорычаў зваярнуў увагу нарады на тых асаблівых умовах прызыву, які адбудзецца ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

Паводле рашэньня Рэвваенсавету СССР сёлета прызыў будзе праводзіцца па месцы працы прызыўніку, а не па месцы іх жыцьця, ці прыпіскі да прызыўных вучастка ў. Гэта мерапрыемства мае асаблівае значэньне ў тым сэнсе, што яно дае магчымасьць прызыўніку менш адрывацца ад работы па вытворчасьці, у калгасе і інш., дзе ён знаходзіўся да прызыву. Такім чынам сёлета прызыў павінен менш за ўсё пашкодзіць выкананьню прамфінпляну, уборачнай кампаніі.

Адначасова з гэтым прызыў па месцы работы дасьць магчымасьць больш уважліва і больш верна вызначыць прызыўніка, забясьпечыць Чырвоную армію ад пападаньня туды клясова варожых і чужых элементаў.

Адзэй з асноўных задач партыйных, камсамольскіх, грамадзкіх і прафэсыянальных арганізацый дадзь Чырвонай армі максымальную колькасьць прызыўнікаў-ударнікаў, ліквідаваць сярод прызыўнікаў няпісьменнасьць, павесьці растлумачальную работу супроць старой рэкруцкай тэндэнцыі «пагуляць» перад прызывам.

Пры гэтым уся работа па правядзеньні прызыву павінна быць цесна ўвязана з выкананьнем прамфінпляну, ліквідацыяй прарываў, правядзеньнем гарадарча-палітычных кампаній.

Даклад сакратара Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б тав. ГЕЯ К. В. на другім усебеларускім зьезьдзе рабселькораў 10 ліпеня 1931 году.

Таварышы! Дазвольце перш за ўсё перадаць вам і ў асобе усёй шматлікай армі рабочых, калгасных, сялянскіх і чырвонаармейскіх карэспандэнтаў гарачае бальшавіцкае прывітаньне ад імя Цэнтральнага Камітэту Камуністычнай Партыі (бальшавікоў) Беларусі (працяжныя воплескі).

I. У ціскох прамысловага і аграрнага крызісу

Падводзячы агульныя вынікі становішча нашага Савецкага Саюзу і капіталістычнага сьвету, мы бачым, як усё больш парэзьвітай становіцца розьніца ў становішчы паміж краінай будаўніцтва сацыялізму і краінамі капіталізму.

У нас мацнее сацыялістычная прамысловасьць ,шпаркімі тэмпамі ажыцьцяўляецца сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі, паляпшаецца матар'яльнае становішча найшырэйшых мільённых мас рабочых і сялян, а там – загніваючы капіталізм б'ецца ў ціскох жорсткага прамысловага і аграрнага крызісу, там дзесяткі мільёнаў людзей ня могуць знайсьці сабе работы, там—голад для дзесяткаў і соцень мільёнаў людзей ,бо яны ня могуць зарабіць на сваё пражыцьцё.

У ліку краін, дзе капіталістычны крызіс асабліва рэзка дае сябе адчуваць у першую чаргу трэба ўспомнуць Нямеччыну і Польшчу—нашых бліжэйшых суседзяў з Захаду.

Нямеччына сьцісьнута ціскамі пляну Юнга. Нямеччына абавязана плаціць вялікія плацяжы па Вэрсальскім дагаворы і цяжар гэтых плацяжоў, якія буржуазія перакладвае на плечы рабочай клясы ,на плечы працоўных, асабліва бальшэвіцкая абдіваецца на становішчы рабочых мас.

У Польшчы таксама дае сябе адчуваць вялізарны нацыянальны падатковага прэсу. Гэты вялізарны падатковы прэс у фашысцкай Польшчы тлумачыцца становішчам польскай дзяржавы, як жандара капіталізму на ўсходзе Эўропы, як узброенай аховы імпэрыялістычнага сьвету ад чырвонай ,бальшавіцкай небясьпекі, ад Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, ад дыктатуры пралетарыяту.

Вось чаму ў Польшчы маюць месца вялізарныя ваенныя падаткі, вось чаму ў Польшчы з яшчэ большай вострасьцю разгортваецца глыбокі прамысловы і аграрны крызіс.

У Польшчы прамысловасьць ня можа з посьпехам змагацца са сваімі больш тэхнічна падрыхтаванымі канкурэнтамі—нямецкай, чэскай прамысловасьцю і прамысловасьцю раду іншых капіталістычных краін.

Гэта тэхнічная адсталасьць побач з высокай ступенью манапалістычнай цэнтралізацыі капіталу, якая гаворыць аб паразітычным выраджэньні капіталізму ў Польшчы—робіць становішча працоўных мас і вострасьць крызісу ў фашысцкай Польшчы найбольш жудасным.

Нарэшце, у фашысцкай Польшчы ёсьць значныя перажыткі фэадалізму. Ня трэба забываць, што ў Зах. Беларусі, усяго за 30 кілёмэтраў ад нас, па чынаецца паласа ,дзе палова ўсіх зямель належыць памешчыкам, ня трэба забываць, што там у адносінах паміж батракамі і памешчыкамі ўсё яшчэ існуе цэлы рад яркіх перажыткаў фэадалізму.

Напрыклад, у глыбінных вобласьцях Польшчы захоўвае дзеяньні і да гэтага часу закон, на падставе якога памешчык мае права цялесна караць батракоў.

Там, у Польшчы існуе закон, паводле якога батрак, наймаючыся да памешчыка, дае побач з гэтым абавязацельства, што і члены яго сямі будуць працаваць па найме толькі ў гэтага памешчыка, а не ў якім-небудзь іншым [illegible]

Гэтыя і цэлы рад іншых перажыткаў фэадалізму ,асабліва б'юць па бяднейшым сялянстве, па батрацтве і робяць іх становішча зараз асабліва безвыхадным, асабліва цяжкім.

Нарэшце, ня трэба забываць і аб тым, што польскі імпэрыялізм ні ў якой ступені ня здолее вырашыць нацыянальныя супярэчнасьці.

Так званыя «Украінскае пытаньне», «Беларускае пытаньне», акупацыя і жорсткая калёніяльная эксплёатацыя украінскіх ,беларускіх зямель, ганеньні на школы нацыянальных меншасьцяў ,ганеньні на мову, насаджэньне ў Зах. Беларусі асадніцтва (легіянэраў Пільсудзкага ў ролі нязначных памешчыкаў) і сотні іншых форм і мэтадаў нацыянальнага прыгнечаньня, якое пасьлядоўна ажыцьцяўляецца фашысцкім урадам, усё гэта стварае яшчэ больш гаручага матар'ялу, усё гэта яшчэ больш напружана завастрае разгортваньне клясавай барацьбы ў Польшчы.

Аб тым, у якім становішчы зараз знаходзяцца працоўныя масы Польшчы і Зах. Беларусі вы можаце судзіць хоць-бы на падставе таго, што ў цэлым радзе выпадкаў сотні сялянак і работніц прыносяць сваіх дзяцей і кладуць іх каля будынку магістрату якое-небудзь гарадзкое ўправы.

Аб тым, да якой глыбіні, да якой бяздонная роспачы давяло шырокія масы рабочых і сялян Зах. Беларусі поўнае ўсьведамленьне безвыходнасьці свайго становішча—вы можаце судзіць хоць-бы і на падставе тых шматлікіх фактаў, калі вулічныя натоўпы беспрацоўных рабочых і работніц не разыходзяцца пры паяўленьні паліцыі, а наадварот беспрацоўныя кладуцца ніц на брук і заяўляюць: «Рабеце, што хочаце, горш, чым цяпер жывецца—нам усёроўна ня будзе». Але натоўпы беспрацоўных не абмяжоўваюцца адной толькі тэпай пасьўнай формай пратэсту. Узброеныя сутычкі, непасрэдная барацьба з пануючым у Польшчы рэжымам фашысцкага крывавага тэрору—становяцца ўсё больш і больш частым, штодзённым зьявішчам.

Тыповай формай забастоўкі ў Польшчы і Заходняй Беларусі становіцца такая форма, калі рабочыя замыкаюцца ў сьцепах прадпрыемстваў і вытрымліваюць працяглую трох-чатырох дзённую асаду польскай паліцыі і фашысцкіх атрадаў. Падобныя забастоўкі і ўзброеныя асады фабрык і заводаў прыводзяць да неаднаразовых крывавых сутычак паміж паліцыяй і жонкамі рабочых, якія імкнуцца прарвацца на прадпрыемства для таго, каб прынесьці сваім мужом і братом харчы. У выніку паліцэйскай стралянины бываюць параненыя і забітыя.

Узрастаючая барацьба супроць крывавага фашысцкага тэрору, шматлікія ўзброеныя сутычкі—усё гэта паступова расхістае рэжым пануючага ў Польшчы фашысцкага тэрору. Польскі фашызм у сваіх руках сканцэнтраваў до сьць вялікія сродкі прыдушэньня і прыгнечаньня рабочых і сялянскіх мас Польшчы. Польскі фашызм змог на некаторы час прыдушыць гэтыя масы, змог спачатку ўнушыць ім прадстаўленьне аб сваёй сіле, аб сваёй несакрушальнасьці. Але гэтыя прадстаўленьні цяпер ужо далёка ззаду. Усё сьмялей і сьмялей выступаюць рабочыя на барацьбу з фашызмам, усё часьцей і часьцей адбываюцца ярасныя крывавыя схваткі паміж рабочай клясай і рэжымам фашысцкага тэрору і ўсё больш узмоцнена пачынае хістацца глеба пад нагамі польскага фашызму.

Рэжым фашысцкага тэрору расхіствае на нашых вачох.

Выступленьні робяцца ўсё больш і больш актыўнымі і мы ня можам прайсьці міма таго, што XI пленум Камінтэрну ахарактарызаваў ,як працэс пасьпяваньня прадпасылак рэвалюцыйнага крызісу. Гэты працэс за апошні час значна прасунуўся наперад у Польшчы і Нямеччыне.

Трэба, таварышы, разумець, што германская камуністычная партыя Польшчы і адэйн з яе лепшых загартаваных у клясавых бёх атрадаў—камуністычная партыя Заходняй Беларусі—працуе ў найцяжэйшых, нелегальных умовах ,ва ўмовах самых жорсткіх праследваньняў ,калі за адну толькі прыналежнасьць да кампартыі прысуджваюць на 8—12 год катаргі.

Трэба таксама ўлічваць і тую акаліч насьць, што камуністычная партыя Польшчы, а ў асабліва сьці і яшчэ ў большай ступені камуністычная партыя Нямеччыны процістаяць старыя сацыял-дэмакратычныя сацыял-фашысцкія партыі ,якія ўсім сваім апаратам зрасьліся з апаратам буржуазнай дзяржавы, партыі, якія ўрастаюць у апарат фашысцкай дыктатуры і ўсёй сілай свайго апарату імкнуцца да таго, каб утрымаць рабочыя масы ад непасрэднай барацьбы супроць буржуазіі.

Сацыял-фашысцкія партыі—гэта тыя самыя партыі, якія заклікалі ў свой час да вайны да пераможнага канца, гэта тыя самыя партыі, якія ўсіляк падтрымлівалі вайну, якія за ўвесь час пасьля вайны і да гэтага часу разьвіваліся ў няўхільным напрамку да фашызму. Сацыял-дэмакратычны ўрад Мільлера пралажыў дарогу для цяперашняга буржуазнага ўраду на чале з Брюнінгам ,пры ўдзеле сацыял-фашысцкай партыі быў выданы цэлы рад законаў ,накіраваных супроць рабочае клясы. Сацыял-дэмакратыя выхавала і ўмацавала свае становішча дзесяткамі гадоў сваёй арганізацыйнай работы. Зруйнаваць капіталізм у краінах Заходняй Эўропы, гэта значыць у першую чаргу падарваць у рабочых колах уплыў сацыял-дэмакратаў. І мы бачым, як гэты ўплыў вельмі шпарка расхіваецца і ў Польшчы і ў Нямеччыне. Мы бачым як вельмі хутка адыходзяць рабочыя масы ад сацыял-дэмакратаў і як усё найбольш сумленнае, здаровае і каштоўнае ў рабочай кляе ідзе ў рады камуністычнай партыі.

Нямецкая кампартыя за апошні час вырасла больш чым у два разы.

Кампартыя Польшчы дабілася рашаючых посьпехаў у цэлым радзе выпадкаў кіраўніцтва эканамічнай барацьбой рабочай клясы і пераводу гэтай барацьбы на больш высокую ступень, на ступень палітычных забастовак, на ступень палітычнай барацьбы.

Усё гэта разам узятае, досыць пераканаўча гаворыць нам аб тым, што са мы жорсткі сусьветны эканамічны крызіс з асабліва вострасьцю адбіваецца менна на Польшчы і на Нямеччыне, стварачы ў гэтых краінах працэсы хуткага насьпяваньня прадпасылак непасрэднай рэвалюцыйнай барацьбы.

Гэта патрабуе ад нас асабліва пільнасьці, асабліва увагі, асабліва напружаньня ўсіх сіл.

Тав. Ленскі—кіраўнік камуністычнай партыі Польшчы, якога мы з вамі толькі што абралі ганаровым членам нашага прэзыдыуму, даў на апошнім пленуме Выканкому камуністычнага Інтэрнацыяналу наступную характарыстыку становішча ў Польшчы.

Ул. Ільліч пісаў у свой час, што рэвалюцыя наступае тады, калі нізы ня хочуць, а вярхі ня могуць кіраваць па-старому. І вось, карыстаючыся гэтай ленінскай фармулёўкай, тав. Ленскі гаворыць аб тым, што сучаснае становішча Польшчы можна ахарактарызаваць так: «Што нізы ўсё больш ня хочуць, а вярхі ўсё менш могуць, хоць усё яшчэ жывуць па-старому».

Адсюль яшчэ раз відаць, наколькі востра становішча ў непасрэдна прылягаючых да нас капіталістычных краінах.

З гэтай вострасьцю становішча зьвязана і тая ліхаманкавая падрыхтоўка да ўзброенага нападу на Саецкі Саюз, да якога ўвесь капіталістычны сьвет рыхтуецца з нябывалай энэргіяй і хуткасьцю.

Беспрацоўных—сотні тысяч і мільёны.Фабрыкі закрытым, работу знайсьці немагчыма. **Але ваенная прамысловасьць ва ўсіх краінах ня ведае, што такое крызіс.** Ваенная прамысловасьць пашыраецца з году ў год. Ваенныя заводы працуюць у тры зьмены з ліхаманкавай шпаркасьцю, выпускаючы для капіталістычных армій, гарматы, кулямёты, танкі і г. д. Калі, напрыклад, Францыя ў 1914 годзе магла вырабіць за месяц 50 тыс. вінтовак ,дык зараз Францыя можа зрабіць 200.000. Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты ў 1914 годзе маглі вырабіць у месяц 50.000 вінтовак, а зараз—400.000.

Цяжкіх гармат у Францыі ў 1914 годзе ў месяц выраблялася 300 штук, а цяпер—1.900 шт.; у Англіі ў 1914 годзе выраблялася 500 шт., а цяпер—1.300 штук.

Вось як паны капіталісты імкнуцца ўмацаваць сваю ваенную магутнасьць, вось што паны капіталісты прыкрываюць сваімі шматлікімі канфэрэнцыямі аб разбраеньні.

Таварышы! **Тут у нас, на Рабсельваенкораўскім зьезьдзе, давайце ўмовімся з вамі аб тым, што ўся работа нашага будаўніцтва, усе пытаньні нашага гаспадарчага жыцьця, усе пытаньні нашай штодзённай работы будзем абмяркоўваць і падначальваць адной мэце—мэце пабудовы сацыялізму ў нашым Савецкім Саюзе, мэце забесьпячэньня перамогі ў карысьць сацыялізму ва ўсім сьвеце.**

II. Выканаем і перавыканаем заданьні трэцяга рашаючага году пяцігодкі

На апошнім пленуме Цэнтральнага камітэту камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі мы абмеркавалі рад важнейшых дзелавых, гаспадарчых пытаньняў аб падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі, аб барацьбе за выкананьне прамфінпляну.

Таварышы, мы закончылі вясновую сяўбу, выканаўшы некалькі звыш 90 проц. таго пляну, які мы перад сабою паставілі.

90 проц. выкананьня пляну веснавой сяўбы—гэта не такія ўжо бліскучыя рэзультаты. Праўда, супроць мінулага году мы пашырылі яравы клін на 7 проц.; праўда, у працэс веснавой сяўбы мы дабіліся рашучага пераломy ў справе калектывізацыі. Калі яшчэ ў



амаль што на 60 проц. (у мінулым годзе было засеяна 140.000 гект., а ў бягучым годзе—звыш 240.000 гект.). Гэта—вялікі крок наперад.

Але, таварышы, мы на гэтым ні ў якім выпадку ня супакоімся. **Для будучага году мы намячаем яшчэ большыя тэмпы далейшага няўхільнага пашырэньня зямельных плошчаў, яшчэ большыя тэмпы пашырэньня пасеву тэхнічных культур.**

За далейшае пашырэньне пасеваў, за лён—мы будзем у далейшым змагацца з усёй бальшавіцкай настойлівасьцю.

Разам з уборачнай кампаніяй будзе праходзіць кампанія асеньняй сяўбы, кампанія зяблеўня—тое, што вызначае сабою пасеўныя плошчы будучага году.

Мы не пакінем у спакоі апартуністаў, якія гавораць, што ў іх раёне няма вольнай зямлі для пашырэньня пасеўнай плошчы. Мы пакажам ім, што зямля ў нас ёсьць.

Мы прымусім рушыць уперад сельскую гаспадарку не старымі, чарапашымі крокамі, а новымі, сацыялістычнымі тэмпамі буйнай сацыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Веснавая сяўба адначасова паказала, што мы як належыць усё яшчэ не правялі зьдзельшчыну ў калгасах. VI Усесаюзны Зьезд Саветаў, наш усебеларускі зьезд саветаў, рад пастаноў кіруючых органаў савецкай улады і партыі—у наяўнасьці. Па гэтых пастановах у калгасах прыняты тысячы рэзалюцый, якія ўхваляюць зьдзельшчыну. Па Беларусі зараз ёсьць каля 8.000 калгасаў. Ня менш чым у 6.000 калгасах прыняты пастановы аб пераходзе на зьдзельшчыну. Рад калгасаў (цяпер іх становіцца ўсё больш) фактычна перайшоў на зьдзельшчыну, правёў яе і наглядна пераканаўся, што зьдзельшчына ў высокай ступені перавышае прадукцыйнасьць працы.

Прыклады падвышэньня прадукцыйнасьці працы, пасьля ажыцьцяўленьня зьдзельшчыны,—паразьлівыя. Зьдзельная работа сябе зарэкамэндавала поўнасьцю, цалкам і безагаворачна.

Калі калгасьнік ведае, што за зіму сьпіной, яго працай на кормяцца гультаі, калі калгасьнік ведае, што кожны атрымае сваю частку ўраджаю ў залежнасьці ад колькасьці і якасьці затрачанай працы, калі ён пераканаецца, што яго памаганьні будуць сапраўды ацэнены, і работа ідзе прадукцыйней, лепш, дружней. Але гэта, таварышы, мае месца пакуль толькі ў лепшых, у перадавых калгасах. Значная-ж частка тых калгасаў, у якіх прынялі пастановы аб пераходзе на зьдзельшчыну, пакуль што гэтых пастаноў ў жыцьцё ўсё яшчэ не правялі. Гэтыя калгасы абмежаваліся прыняцьцем пастановы, але яны ня здолелі і да гэтага часу перабудаваць сваю работу, ня здолелі паставіць справу так, каб улічыць работу кожнай брыгады, каб ацаніць у працадні работу кожнага калгасьніка.

Мне пры аб'ездах калгасаў ня раз здаралася праводзіць гутаркі з калгасьнікамі. Калі, бывала, задаеш калгасьнікам пытаньне аб тым, як яны, калгасьнікі, працуюць, дык адказ бываў наступны: «Так мы зьдзелна працуем—падзённа». І калі высьвятляеш у чым справа, што гэта за такая зьдзельная работа ў выглядзе падзённы, дык аказваецца, што калгасьнікі фактычна працуюць падзённа, але гаворыць, што працуюць зьдзельна, бо яны галасавалі і прынялі пастанову аб увядзеньні зьдзельшчыны. На справе, у радзе месц і да гэтага часу атрымліваецца так, што той, хто вышаў на работу, атрымліваў «палачку», а той, хто на работу ня вышаў, таму нічога ня пішацца, а ўлік колькасьці зробленай работы, нават улік трудзасьці пароблены работы—у значнай частцы калгасаў яшчэ не вядзецца.

І вось, таварышы, у барацьбе за зьдзельшчыну вялізную ролю заклікан адыграць наш друк.

Я дазволю сябе прыпасьці вытрымку з аднаго з артыкулаў Ул. Ільліча Леніна. Ленін пісаў: «Мы павінны пераўтварыць і мы пераўтворым прэсу з органу сэнсацыі, з простага апарату—для паведамленьня палітычных навін, у орган барацьбы супроць буржуазнай хлусьні—у зброю эканамічнага перавыхаваньня масы, у зброю азнаямленьня масы з тым, як трэба наладжваць працу па-новаму». Цяпер, калі пад кіраўніцтвам партыі перабудоўваецца на сацыялістычны лад вялізная махіна нашай сельскай гаспадаркі, мы павінны навучыць працаваць па-новаму тысячы і мільёны людзей, бо работа ў калгасе—гэта не ранейшая работа ў раздробленай сельскай гаспадарцы, а гэта праца арганізаваная, гэта ўжо сумесная праца ў буйнай гаспадарцы сацыялістычнага тыпу. Мы не навучым калгасьніка працаваць па-новаму, калі наш пралетарскі друк ня зробіць сваім вядучым лёзунгам тую задачу, якую Ул. Ільліч яшчэ ў 1918 годзе перад намі высоўваў: «Пераўтварыць нашы і газэты ў зброю азнаямленьня масы з тым, як трэба наладжваць працу па-новаму».

Вось, таварышы, вялізнейшая задача, якая стаіць перад пралетарскім друкам, як ня толькі калектыўным аўтатарам і прапагандыстам, але і калектыўным арганізатарам, задача, якую вы павінны арганічна ўвязаць як адно цэлае, і са справай падрыхтоўкі да асеньняй ўборачнай кампаніі і барацьбой за ліквідацыю прарываў у прамфінпляне, з барацьбою за ажыцьцяўленьне нашых асноўных гаспадарча-палітычных заданьняў.

Першы крок, які нам трэба ажыцьцёвіць для таго, каб з посьпехам правесьці ўборку гэта вядома—поўнае правядзеньне зьдзельшчыны ва ўсіх, бяз выключэньня, калгасах.

Другі крок—гэта арганізацыя адпаведнай перакідкі рабочай сілы з тых месц, дзе ёсьць лішкі рабочай сілы, у тыя месцы, дзе яе не хапае.

Ці ў выстарчальнай колькасьці ў нас рабочай сілы, для таго, каб выканаць у меру шпарка і добра ўборку ўраджаю? Вы ведаеце, што ў мінулым годзе сёе-тое з ураджаю ў нас засталося ня ўбраным. Вы ведаеце, што там-сям уборка бульбы, напрыклад, праводзілася настолькі павярхоўна і недобрасумленна, што частка бульбы засталася нявыкапанай з зямлі. Ці можам мы сёлета ўхіліцца ад тых прарэхаў і прарываў, якія мелі месца ў мінулым годзе? Я адказваю з усёй упэўненасьцю, упэўненасьцю абгрунтаванай на дакладных падліках, што рабочых рук для своечасовай ўборкі ўраджаю ў нас ёсьць з ліш кам.

Пры правільнай арганізацыі працы, пры скарыстаньні рабочай сілы ў калгасах (а скарыстаць рабочую сілу ў калгасах—значыць прыцягнуць да ўбор кі ня толькі аднаго члена сямі, але і ўсіх працаздольных членаў сямі калгасьніка)—пры гэткай умове калгасы па БССР у цэлым, нават у момант най больш напружанай работы ў асеньняўборачную кампанію маюць значны лішак рабочай сілы.

Заява аб тым, што ў нас не хапае рабочых рук, што мы ня можам справіцца па «аб'ектыўных прычынах» таму, што няма рабочых рук—такія заявы мы павінны і будзем разглядаць, як апартуністычныя.

Наш друк павінен будзе ў першую чаргу атакаваць гэтыя апартуністычныя спасыланьні на «аб'ектыўныя прычыны». Падобныя спасыланьні на «аб'ектыўныя прычыны» будуць зьведчыць толькі аб тым, што даныя работнікі ня ўмеюць як сьлед арганізаваць рабочую сілу, што даныя работнікі плывуць на хвалях апартуністычнага самацёку.

Тая акалічнасьць ,што ў калгасах мы маем нават у самую страдную пару значны лішак рабочых рук дае нам магчымасьць разьмеркаваць рабочую сілу такім чынам, каб пераключыць з найбольш забясьпечаных калгасаў у саўгасы (дзе сапраўды маецца некаторы недахоп рабочай сілы) у некаторыя больш слабыя калгасы, якія паравуньляна мала забясьпечаны рабочай сілай.

І задача падрыхтоўкі да перакіданьня гэтых вольных рабочых рук у суседні калгас або саўгас ,дзе адчуваецца ў іх недахоп—гэта задача ня зможа быць вырашана бяз значнай выхаваўчай работы, без перавыхаваньня калгасьніка.

Гэта задача ў сэнсе важнасьці і чарговасьці зьяўляецца другой нашай задачай, выкананьне якой забясьпечыць пасьпяховасьць падрыхтоўкі і выкананьня асеньняй уборачнай кампаніі.

Зразумела, побач з гэтым ёсьць дзесяткі іншых вельмі важных і вельмі істотных пытаньняў, якія высоўваюцца ходам падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі. Пытаньне далейшага росту больш шырокага размаху барацьбы за тэхнічныя культуры зьвязваецца за скаченьнем пабудовы лёнаапрацоўчых заводаў. Паўстае і такая задача ,як кармавая праблема, хутчэйшае вырашэньне якой непаруўна зьвязана з далейшым разьвіцьцём жывёлагадоўлі ў БССР. Пытаньне арганізацыі ўборкі, праполкі ў прыгарадных гаспадарках ЦРК, пытаньне загатовак гародніны для гораду, пытаньне сілаваньня кармоў, забясьпечаньня тарай, памяшканьнямі, і цэлы рад іншых важнейшых пытаньняў мы ня можам пасьпяхова зьдзьвязаць ,калі друк, калі ўся маса рабселькораў ня будзе працаваць пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый, над гэтымі пытаньнямі штодня і сыстэматычна.

Да апошняга пленуму ЦК мы мелі па выкананьні прамфінпляну значныя прарывы. За 5 месяцаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі мы выканалі заданьне ўсяго толькі на 85 проц. Па групе вырабу сродкаў вытворчасьці—выкананьне прамфінпляну складае 57,3 проц. А ёсьць цэлыя галіны прамысловасьці, якія выканалі за 5 месяцаў свой прамфінплян толькі на якія-небудзь 17 проц. Возьмем напрыклад, прадпрыемствы па вырабе цэглы, тае самае цэглы, якая зараз да-зарэзу патрэбна, бо будаўнічы сэзон у разгары. Асноўным тормазам у разгортваньні будаўніцтва зараз зьяўляецца адсутнасьць будаўнічых матар'ялаў. А між тым, ці-ж у нас на Беларусі не хапае гліны? Гліна ў нас сустракаецца на кожным кроку. Ці-ж у нас няма апалу для цегельняў? Торф і дровы ў нас знаходзяцца побач з цегельнямі. Справа ў тым, што тут няма ўменьня ў гаспадарчых органаў, у партыйных і прафэсіянальных арганізацыях прыцягнуць рабочыя рукі на цегельні, замацаваць за цегельнямі рабочую сілу. Дзякуючы гэтаму, выраб будаўнічых матар'ялаў зараз стаіць на самым апошнім месцы па выкананьні прамфінпляну.

Буйнейшы і ганебнейшы прарыў у нас ёсьць у такой галіне, як здабыча торфу. У гэтай галіне і друк у пэўнай меры адказвае за маючыяся прарывы. Недастаткова мы ўсё разам з вамі свае часова сыгналізавалі аб гэтым прарыве, недастаткова арганізавалі масы і паказвалі шляхі перамаганьня прарыву. Сёлета плян па здабычы торфу ў два з паловай разы большы, чым летась, а выканана—менш чым летась. Трэба сказаць, што сярод другіх рэспублік Савецкага Саюзу БССР па выкананьні пляну здабычы торфу займае другое месца, але другое месца з канца.

У нас ва ўсіх перад вачыма маецца прыклад Маскоўскай партыйнай арганізацыі ,якая здолела вырашэньне праблемы торфу паставіць сапраўды пабяльшому, якая здолела пры гэткіх-жа абставінах, як і ў Беларусі ,кінуць на барацьбу за торф адпаведныя партыйныя сілы, здолела дамагчыся разгорнутай работы, якая забясьпечвае выкананьне і перавыкананьне пляновага заданьня па торфе. Нам трэба і ў галіне тарфянай прамысловасьці БССР дамагчыся гэткага-ж рашучага пераломy, які ёсьць у Маскоўскай вобласьці. Трэба вельмі добра памятаць аб тым, што будзе торф—будзе разьвівацца прамысловасьць у Беларусі.

Таму агульная задача ўсёй КП(б)Б і адна з базавых цэнтральных задач і рабселькораўскага зьезду — паставіць тарфянную праблему настолькі ў цэнтры ўвагі, завастрыць у такой ступені ўвагу пралетарскай прамадзкасьці, каб уся партарганізацыя, уся рабочая маса добра сабе ўявіла тое, якое вялікае значэньне мае разгорнутая барацьба за торф для будаўніцтва сацыялізму ў нас, на Беларусі, як неадымнай, складанай часткі Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Ліпеньскі пленум ЦК КП(б)Б, абгаварваючы пытаньне выкананьня прамфінпляну, выходзіў у рашэньнях з апошняга выступленьня тав. Сталіна на зьезьдзе гаспадарнікаў. Галоўнае заключаецца ў тым, каб па-новаму паставіць пытаньне аб зярбоўцы, падрыхтоўцы і замацаваньні рабочай сілы на прадпрыемствах. Некаторым нашым гаспадарнікам не хапае рабочых рук для выкананьня прамфінпляну, «таму, дзе, што НКПрацы гэтых рабочых рук не дае». Мы разглядаем гэткага роду заяву, як праяву простага апартунізму таму, што зараз справа НКПрацы—рэгуляваць пытаньнямі разьмеркаваньня і вярбоўкі рабочай сілы, а правядзеньне непасрэднай вярбоўкі рабочай сілы, прыцягненьне, замацаваньне рабочай сілы на прадпрыемствах—задача гаспадарчага кіраўніцтва.

Апошні дэкрэт савецкага ўраду адносна адыходніцтва прадстаўляе шырокія магчымасьці шляхам заключэньня дагавораў паміж прадпрыемствамі і калгасам, апрымліваць рабочую сілу. Гэты дэкрэт захоўвае інтарэсы калгасьнікаў адыходнікаў, стварае вялікую магчымасьць для нашых прадпрыемстваў папоўніць свой некамплект рабочай сілы. Трэба, каб на прадпрыемствах была створана зацікаўленасьць рабочых, трэба, каб рабочы ведаў, што, прапрацаваўшы на пэўным прадпрыемстве, ён апрымлівае вядомую кваліфікацыю, інакш ён выйдзе з прадпрыемства, будзе шукаць такую работу, якая дазволіць яму падвысьць сваю кваліфікацыю.

Трэба каб было пастаўлена ва ўсёй шырыні пытаньне аб культурна-бытавым абслугоўваньні рабочых [illegible] ных прадпрыемствах. Пастаноўка харчаваньня рабочых, перабудова каапэрацыі—важнейшая задача. Каапэрацыя перабудоўваецца зусім дрэнна. Прыступілі да перабудовы, пачалі перабудоўваецца і што-ж атрымалася?—Атрымалася ,быццам машына разваліцца і не перабудоўваецца. У каапэрацыі сядзіць пэўная колькасьць наскрозь апартуністычных элемэнтаў, якія галасуюць за лінію ЦК, за ўсе рэзалюцыі, што прапануем на сходах, якія заяўляюць на словах сваю згоду з генэральнай лініяй партыі, з перабудовай каапэрацыі, а на справе гэту перабудову сабатуюць, на справе ўсе мерапрыемствы па арганізацыі сеткі закрытых рабочых каапэратываў, па гаспадарчым умацаваньні гэтых закрытых рабочых каапэратываў, па вылучэньні спэцыяльных відаў каапэратываў для лясных рабочых, вайсковых каапэратываў, транспартных каапэратываў, па стварэньні галінных аб'яднаньняў—сабатуюць, імкнуцца фактычна прывесьці каапэрацыйную машыну да такога становішча ,каб яна ня здольна была ехаць ні ўзад ні ўперад.

Пытаньні культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых, пытаньні палепшаньня работы закрытых рабочых каапэратываў ,сталовак, умацаваньне іх гаспадарчай базы—зьяўляецца зараз сустаўным зьвяном барацьбы за выкананьне прамфінпляну.

Трэба на прадпрыемствах ліквідаваць абязьлічку, якая глыбока прасякнула ва ўсе галіны нашай народнай гаспадаркі. Ліквідацыя абязьлічкі—гэта перш за ўсё прымацаваньне кожнага рабочага да пэўнай машыны. Але гэтым не абмяжоўваецца ліквідацыя абязьлічкі. Абязьлічка—гэта значна больш шырокае разуменьне і ліквідацыя абязьлічкі—гэта таксама значна больш шырокая задача. У нас абязьлічкай прасякнута ўся работа на прадпрыемстве, бо ў нас час-часам ніхто ні заш то не адказвае, бо ў нас вельмі часта зьмены разьмеркаваны так недарэчна, што сёньня вы працуеце з адным складам работнікаў, заўтра з другім, пасьлязаўтра—з трэцім, на чацьверты дзень—чацьвертым, і можа стацца ніколі ня зьвернецеся ў той ранейшы склад, з якім вы ў самым пачатку працавалі.

Абязьлічка на прадпрыемствах—гэта адсутнасьць адказнасьці за выконваемую работу.

Мы павінны прарабіць вялікую работу па ўвядзеньні сталых зьмен, па стварэньні сталых брыгад, па стварэньні сталага складу брыгад. Мы павінны правесьці вялікую работу па вылучэньні сталых адказных асоб, каб брыгада, скажам тав. Іванова ,была-б і працавала ў адным сталым складзе, а брыгада т. Пятрова—ў другім, таксама сталым складзе. Толькі тады мы зможам забясьпечыць далейшыя яшчэ больш глыбокія посьпехі сацыялістычнага спаборніцтва ,дасягненьні шляхам перавыкананьня вынікаў працы.

І, зразумела, трэба на прадпрыемстве паставіць пытаньне аб зьмене сыстэмы аплаты працы.

Мы ўводзім зьдзельшчыну ў калгасы, а ў нас на прадпрыемствах і на перадавых прадпрыемствах гораду Віцебску, напрыклад, ад зьдзельнай аплаты перайшлі на пачасовую аплату працы.

Абсьледваньне праведзенае ЦК КП(б)Б, ускрыўшае рад прарываў Віцебскай арганізацыі, дало нам матар'ялы і такога роду ,што на дзух прадпрыемствах палова ўсёй зьдзельнай работы за апошні год была пераведзена на пачасовую аплату працы.

Зусім відавочна, што пачасовая плата працы ні ў якай ступені не стымулюе падвышэньня прадукцыйнасьці працы.

Досыць часта кожнаму з нас прыходзіцца сустракацца і з такім становішчам рэчаў, што рабочы, які капае роў на заводзкім двары, зарабляе, часам, у два разы больш ,чым высока кваліфікаваны сьлесар ,які працуе ў цэху.

Трэба сур'ёзьнейшым чынам перагледзець усю сыстэму аплаты працы і ўзяць асноўным, кіруючым прынцыпам гэтага перагляду той выходны пункт, што сыстэма аплаты працы павінна стымуляваць далейшае падвышэньне прадукцыйнасьці працы. Вось у гэтым —кіруючая мерка.

Работу па перагляду сыстэмы аплаты працы трэба праводзіць на прадпрыемствах наўроўне з работаю па аўладаньні тэхнікай, па выхаваньні новых кадраў, тэхнічна падрыхтаваных спэцыялістаў са складу рабочай клясы, (дарэчы, зьмяняючы адносіны да тых са старых спэцыялістаў, якія хоць і выхоўваліся ў буржуазнай школе, але зараз аддалі сябе справе пралетарыяту, перастаць пазіраць на кожнага спэцыяліста, як на ня злоўленага шкодніка)..

Усе гэтыя пытаньні мы зможам прасунуць уперад і ажыцьцявіць толькі пры ўмове ўзмацненьня і перабудовы адпаведнай партыйнай работы на прадпрыемствах, а таксама пры ўмове ўзмацненьня і рашучай перабудовы ўсяго нізавога друку на нашых прадпрыемствах, пры ўмове стварэньня баявых, апэрацыйных насьценных штодзённых газэт у цэхах, насьценных газэт у брыгадах, агрэгатах, у кожным калгасе, саўгасе, МТС і г. д.

Пленум ЦК КП(б)Б асабліва сур'ёзна завастрыў увагу на неабходнасьці перабудовы партыйнай работы на прадпрыемствах.

III. „Друк--самая моцная, самая вострая зброя партыі"

У сваім дакладзе я сабе ставіў задачу—падагуліць тыя найбольш агульныя і найбольш ударныя пытаньні, над якімі мы з вамі зараз будзем працаваць—гэта пытаньні падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі і далейшае разгортваньне калектывізацыі ў духу тых намётак, аб якіх казаў тав. Будзінскі ў сваім уступным слове (ня менш 75 проц. калектывізацыі да вясеньняй кампаніі 1932 г.), барацьба за прамфінплян ва ўсіх яго зьвяньнях, за ўсе яго колькасныя і якасныя паказьнікі, у тым ліку і ў першую чаргу па торфе, выкананьне будаўнічай праграмы (а будаўніцтва ў нас вельмі многа!) і перабудова нашай работы на прадпрыемствах у духу тых указаньняў, якія зроблены тав. Сталіным у яго апошнім гістарычным выступленьні на нарадзе гаспадарнікаў.

Мне хацелася-б пасьля гэтага кароткага пераліку нашых гаспадарчых задач прысьвеціць спэцыяльна некалькі заўваг пытаньню друку, як гэткаму і ролі рабселькораў у сучасны момант.

Я ўжо прывёў цытату Ўладзімра Ільліча. Ўладзімір Ільліч патрабаваў ад нас, каб друк вучыў нас новым мэтадам работы.

Я прыведу вам водзыў тав. Сталіна аб тым, што: «наш друк ўсё яшчэ сьлізгае па паверхні, ён яшчэ не навучыўся пераходзіць ад паасобных крытычных заўваг да больш глыбокай крытыкі, а ад глыбокай крытыкі да абагуленьня вынікаў крытыкі, да вылены ў галіне нашага будаўніцтва ў выніку крытыкі».

Мы ставім такім чынам перад нашым друкам не якія-небудзь асаблівыя і асобныя задачы. Задачы друку—гэта ўсё тое, над чым працуе наша партыя, усё тое над чым працуе і што ажыцьцяўляе сав

Даклад сакратара Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б тав. ГЕЯ К. В. на другім усебеларускім зьезьдзе рабселькораў 10 ліпеня 1931 г.

кожнай гаспадарчай ячэйцы было-б некалькі пар вачэй, якія сочаць за ходам работы, крытыкуюць недахопы і асабістым прыкладам, арганізуючай сілай асабістага прыкладу паказваюць шляхі выпраўленьня недахопаў, шляхі выкананьня і перавыкананьня плянаў разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва.

Толькі пры наяўнасьці такога масавага кантролю і праверкі выкананьня, толькі пры наяўнасьці такой шырока разгорнутай пралетарскай самакрытыкі, якая дазволіць кожны недахоп у рабоце заўважваць і выпраўляць своячасова, толькі пры ўмове сыстэматычнага і разгорнутага, глыбокага паказу дасягненьняў сацыялістычнага будаўніцтва на старонках нашага друку, толькі пры ўмове павышэньня ролі рабселькораў, як арганізатараў мас, пад кіраўніцтвам партыі, за выкананьне і перавыкананьне вытворчых плянаў,—магчыма далейшая пасьпяховая работа. Гэту ролю павінен выконваць наш друк. Для выкананьня друкам гэтай задачы, якая забясьпечыць выкананьне плянаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі—плянаў нашага гаспадарчага будаўніцтва,—мы ішлі, ідзем і будзем ісьці на рад рашучых крокаў, наносячы руйнуючыя, вышчаючыя ўдары па апартуністычных элементах, якія спрабуюць зажымаць самакрытыку.

ЦК КП(б)Б прарабіў вялікую работу, адзначаную рэдакцыйным артыкулам Ц. О. «Правды» і ў галіне пастаноўкі і разгортваньня нізавога і раённага друку і перабудовы рабселькораўскага руху, у адпаведнасьці з рашэньнем ЦК УсеКП(б) ад 16 красавіка 1931 г.

Мы ў прыватнасьці ўтварылі зараз 45 раённых газэт, 16 новых раённых друкарань. Зразумела, недахопы друку мы затушоўваць ня будзем. Справа маладая, новая—разьвіваецца ў такіх умовах, пры якіх магчымы асобныя прарывы, асобныя недахопы і недаліки. І на гэту справу—на справу самага рашучага ўмацаваньня нізавога друку і забесьпячэньня сыстэматычнага, глыбокага партыйнага кіраўніцтва рабселькораўскім рухам мы таксама павінны зьвярнуць зброю самакрытыкі. Трэба з усёй рашучасьцю і чоткасьцю сказаць, што ўся партыйная арганізацыя ў цэлым, кожная партыйная ячэйка паасобку нясе непасрэдную адказнасьць за становішча нізавога друку і забесьпячэньне партыйнага кіраўніцтва рабселькораўскім рухам.

Вось характарная вытрымка з матар'ялаў праведзенага нядаўна па 55 раёнах БССР масавага агляду—самаправеркі становішча нізавога друку, рабселькораўскага руху і партыйнага кіраўніцтва ім: «Складу рэдкалегій у большасьці засьмечаны клясава-варожымі элементамі. Меліся выпадкі, калі да выпуску насьценгазэты прыцягваюцца варожыя элементы за плату—паўлітра гарэлкі. Маюцца выпадкі, што ў насьценгазэтах не зьмяшчаюцца заметкі, без папярэдняга прагляду сакратара, ці члена бюро партячэйкі». Зразумела гэта асобныя, мажліва адны з самых яркіх фактаў прарыву ў галіне пастаноўкі нашага нізавога друку, прарыву, які зьяўляецца простым, непасрэдным вынікам адсутнасьці якога-б ні было партыйнага кіраўніцтва насьценнай газэтай, фактам, калі клясавы вораг, карыстаючыся адсутнасьцю партыйнага кіраўніцтва, узяў у свае рукі з клясава-варожымі мэтамі насьценную газэту. Зразумела, ні ў якім выпадку не дазволім гэтыя асобныя абураючыя факты абагульваць. Мы ведаем, што друк у цэлым і нізавы друк у тым ліку—гэта зброя камуністычнай партыі ў барацьбе за сацыялістычнае будаўніцтва, за высокія тэмпы гэтага будаўніцтва. І прывёў гэты яркі факт засьмечанасьці для таго, каб падкрэсьліць, што ў тых вывеньнях, дзе найбольш слабае ці зусім адсутнічае партыйнае кіраўніцтва, там з яшчэ большай настойлівасьцю клясавы вораг імкнецца заваяваць сабе пазыцыю.

Апошняя пастанова ЦК УсеКП(б) ад 16 красавіка г. т. па пытаньні аб перабудове работы рабселькораў дае вычарпальную ўстаноўку ў пытаньне далейшага кіраўніцтва рабселькораўскім рухам, у пытаньні аб тым, што неабходна, не забываючы аб неабходнасьці работы з рабселькорамі адзіночкамі, дамагчыся ператварэньня ўдарных брыгад друку ў вядучае зьвяно рабселькораўскага руху. Гэта пастанова высоўвае рабселькора менавіта як камандзіра грамадзка-пралетарскай думкі, якая зараз палкам, без астатку накіравана на справу сацыялістычнага будаўніцтва, якая працуе зараз над выкананьнем ўсіх тых задач, над якімі працуе і камуністычная партыя. У гэтай пастанове ЦК УсеКП(б) асоба падкрэсьлівае, што кіраўніцтва рабселькораўскім рухам не павінна весьціся «наогул». ЦК УсеКП(б) у сваім рашэньні асоба падкрэсьлівае аб неабходнасьці рабселькорам, змагаючыся за прамфінплян, змагацца в бюракратызмам, шкодніцтвам і са спробамі кулацтва і яго агентуры ў асобе насьбітоў правай небясьпекі—галоўнай на даным этапе і «левых» апартуністаў сарваць тэмпы сацыялістычнага наступленьня і сказіць лінію партыі, усё гэта канкрэтызаваць стасоўна да розных вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва, на якіх рабселькоры працуюць.

Трэба паставіць кожнага рабселькора ў такое становішча, каб ён у сваёй галіне прамысловасьці, у сваёй галіне работы змагаўся за ажыцьцяўленьне канкрэтных задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Зараз недастаткова змагацца з апартунізмам «наогул». Апартунізм, як вы ўжо бачылі з папярэдняй часткі майго дакладу часта праяўляецца ў радзе канкрэтных установак па цэлым радзе важнейшых пытаньняў сацыялістычнага будаўніцтва.

Апартунізм змагаецца супроць пашырэньня пасеўнай плошчы, супроць пашырэньня тэхнічных культур, супроць пераходу на тарфяны апал, супроць перабудовы спажывецкай кааперацыі.

Трэба, напрыклад, у прыватнасьці, узброіць рабселькора, які працуе ў галіне спажывецкай кааперацыі, такімі ведамі, каб ён умеў добра і пасьпяхова змагацца, менавіта з тымі апартуністамі, якія тармозяць перабудову кааперацыі, трэба ўзброіць адпаведнымі ўстаноўкамі, адпаведнымі ведамі рабселькора, які працуе на торфе, каб ён умеў пасьпяхова змагацца менавіта з падвышэньне, за якасьць здабычы торфу, каб транспартнік змагаўся за спараную язду, за цэлы рад іншых мерапрыемстваў, на ажыцьцяўленьне якіх партыя мабілізуе масы і г. д. і да т. п. **Дабіцца рашучага пералому ў рабселькораўскім руху, у яго перабудове—адна з першачарговых задач усёй КП(б)Б.**

У пастанове ЦК УсеКП(б) ёсьць паказаньне аб тым, што партыйнае кіраўніцтва рабселькораўскім рухам, асабліва ў нацыянальных рэспубліках, вобласьцях і раёнах пастаўлена нездавальняюча. Мы прымаем поўнасьцю і палкам гэта паказаньне. Мне здаецца, таварышы, што вялізарным праблемам у рабоце менавіта партыйнай арганізацыі Беларусі зьяўляецца тая акалічнасьць, што пасьля першага зьезду рабселькораў, які адбыўся ў 1924 г., мы другі ўсебеларускі зьезд рабселькораў склікалі толькі праз сем год—у 1931 годзе. Гэты вялікі перарыў сьведчыць аб тым, што за рабселькораўскі рух мы, ў БССР, у працягу цэлага раду год ня браліся як сьлед.

Дазвольце мне, таварышы, сёньня заявіць, **што наша партыйная арганізацыя,** прарабіўшы вялікую работу ў барацьбе за разгортваньне самакрытыкі, у барацьбе за разгортваньне нізавога друку, ставіць сваёй адной з першачарговых задач,—дабіцца далейшага самага рашучага пералому ў галіне рабселькораўскага руху, дабіцца поўнай перабудовы рабселькораўскага руху на аснове рашэньня ЦК УсеКП(б), дабіцца падвышэньня актыўна-арганізатарскай ролі рабселькораў, як непасрэдна на вытворчасьці, так і праз друк, дабіцца больш поўнага і сыстэматычнага кіраўніцтва рабселькораўскім рухам з боку нашай партыйнай арганізацыі, з боку нашага партыйна-савецкага друку.

За бальшавіцкія тэмпы, за бальшавіцкую якасьць усёй нашай работы

Трэба дабіцца высокіх тэмпаў работы!

У цэлым радзе задач Беларусь ня можа пахваліцца высокімі паказальнікамі выкананьня: з вялікімі цяжкасьцямі, з вялікім напружаньнем мы такся выконваем нашы задачы, але мы ўсё-ж яшчэ не зьяўляемся перадавой рэспублікай Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік па ажыцьцяўленьні гаспадарча-палітычных задач.

Наша агульная з вамі задача—змагацца за самыя высокія тэмпы работы, за прамфінплян, за калектывізацыю, за ўборачную, за торф, змагацца за чоткасьць, за выканаўчасьць у гаспадарчых арганізацыях, за поўную ліквідацыю абязьлічкі, за ўвядзеньне поўнай адказнасьці, за адхіленьне бюракратаў, якія спрабуюць зрываць нашу работу; змагацца за тое, каб выкананьне важнейшых гаспадарча-палітычных задач у нас праходзіла своячасова і ня толькі поўнасьцю на ўсе сто процантаў, але і з перавышэньнем.

Я думаю, таварышы, што другі ўсебеларускі зьезд рабсельвасенкораў павінен паклясьці і пакладзе пачатак яшчэ больш шырокаму разгортваньню рабселькораўскага руху ў Беларусі і гэты рух, пад кіраўніцтвам нашай партыі, будзе зьяўляцца адной з моцных зброй у барацьбе за сапраўды бальшавіцкія тэмпы работы ўсёй КП(б)Б, у барацьбе за поўнае выкананьне і перавыкананьне ўсіх задач 3-га рашаючага году пяцігодкі, у барацьбе за выкананьне задач пабудовы сацыялізму ў нашай краіне! (Доўгія воплескі).

*) Працяг. Пачатак глядзі «сав. Бел.» № 164.

¹) З перадавога артыкулу «Правды»—«Супроць дыктатуры буржуазіі за дыктатуру пралетарыяту!» 23 красавіка 1931 г. № 113.

²) З дакладу т. Ленскага на XI пленуме Камінтэрну, «Правда» № 128 за 11 мая 1931 г.

Сёньня пачынаецца дэкаднік рэалізацыі пазыкі на вёсцы

У дэкаднік разгарнуць масавую работу сярод рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў, каб да 1 жніўня поўнасьцю выканаць заданьне

Усю работу па рэалізацыі пазыкі на вёсцы правесьці на аснове сацспаборніцтва

Посьпех рэалізацыі пазыкі ў горадзе быў выключна дзякуючы энтузіязму рабочае клясы. Гэты посьпех паказаў, што разгортваючы сапраўды бальшавіцкія тэмпы можна пляны ня толькі выканаць, але і перавыканаць.

Зараз перад краінай стаіць вялікая задача поўнасьцю рэалізаваць пазыку на вёсцы. Шмат у гэтай справе можа дапаматчы вопыт рабочае клясы, як трэба поразьсьці ў вёску, каб і там пасьпяхова правесьці кампанію рэалізацыі пазыкі.

У зьвязку з гэтым прэзыдыум Усе ЦСПС, ЦК ЛКСМ, праўленьне калгасцэнтру СССР і РСФСР і Цэнтральная Камісія Садзейнічаньня Дзяржкрэдыту і ашчадправе пастанавілі арганізаваць з 20-га ліпеня дэкаду па рэалізацыі пазыкі на вёсцы.

У пастанове сказана, што прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі, усе калгасы і ўсе камсоды павінны ў гэты дэкаднік усю сваю ўвагу зьвярнуць на рэалізацыю пазыкі ў вёсцы. Для гэтага яны павінны сумесна выдзеліць кантрольныя пасты і групы садзейнічаньня для прасоўваньня агітматар'ялаў у вёску.

Да пачатку дэкады на ўсіх цэхах і рабочых пасёлках павінны быць наладжаны выезды фабрычна-заводзкіх камітэтаў разам з камсодамі і камсамольскім актывам, а таксама і дэпутацкімі групамі гарсаветаў, дзе трэба паставіць пытаньне аб дапамозе вёсцы ў рэалізацыі пазыкі.

У часе дэкады неабходна арганізаваць выезды ў кожны сельсавет спэцыяльных брыгад прафсаюзнага, камсамольскага і дзяржкрэдытнага актыву. Усю ўвагу на работу ў вёсцы павінны зьвярнуць саюзы працаўнікоў мастацтва, працасьветы, дзяржустаноў, гандлю і кааперацыі і камсамол, а таксама і ўсе шэфствуючыя арганізацыі.

Паслаць на арганізацыю пазыкі ў вёсцы рабочых адпускнікоў па лініі зямляцкай сувязі і г. д. Акрамя таго, трэба арганізаваць рад выездаў члена праўленьня прафсаюзаў і інш. кіруючых арганізацый на гэтую работу.

Кожны райкамсод павінен зрабіць ня менш трох выездаў у вёску ў гэтую дэкаду. Райкамсоды павінны арганізаваць на мясцох куставыя канфэрэнцыі-зьлёты камсодаў пры саўгасах і МТС.

Асноўным мэтадам растлумачальнай работы сярод аднаасобнікаў,—гэта падворны абход аднаасобнікаў спэцыяльнымі брыгадамі сельскага актыву. Усе іншыя кампаніі (уборка ўраджаю і інш.) павінны спалучыцца з рэалізацыяй пазыкі. Уся работа па падпісцы павінна быць перанесена ў поле, у брыгады. Трэба арганізаваць буксір адпаведнай сілай перадавікоў у падпісцы.

Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на пастаноўку вучоту ў падпісцы сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў, для чаго трэба мабілізаваць сельскі актыў.

Уся работа па правядзеньню дэкады на вёсцы павінна праходзіць на аснове шырокага разгортваньня сацспаборніцтва.

Л. П.

Да 1 жніўня рэалізаваць абавязацельствы

Плян вытворчага крэдытаваньня сельскай гаспадаркі БССР прадугледжвае ўкладаньне 1.450.000 руб., якія павінны быць выручаны ад рэалізацыі абавязацельстваў «Сельгасснабжэньня» сярод калгасаў і аднаасобных гаспадарак.

Пастановай СНК СССР быў вызначан тэрмін сканчэньня гэтай кампаніі 1 ліпеня, але, у зьвязку з тым, што па становішчу на 1 ліпеня плянавае заданьне ў 1.450.000 руб. было ўсяго выканана толькі на 7,9 проц., альбо рэалізавана абавязацельстваў на суму 115.584 руб.—**урадам была дана адтэрміноўка яшчэ на 1 м-ц, г. зн. да 1 жніўня.**

Цікава пабачыць, як прыцягнутыя да непасрэднай работы па разьмяшчэньні машынных абавязацельстваў установы і арганізацыі займаюцца гэтай справай? Маючыся ў нашым распараджэньні даныя на 10 ліпеня г. т. высьвятляюць наступнае:

Рэспубліканскі плян выкананы на 10,7 проц., альбо рэалізавана абавязацельстваў на 155.917 руб.

Прычым выкананьне асобнымі сыстэмамі характарызуецца наступным:

а) калгасна-кааперацыйная сыстэма разьмясьціла на 100.839 р., альбо 7,4 проц.; б) сыстэма Белсельгасснабу рэалізавала на 55.078 р., альбо 42,3%.

Такім чынам, на сёньняшні дзень асаблівая адстаючай зьяўляецца калгасна-кааперацыйная сыстэма.

Пры бліжэйшым разглядзе даных аб рэалізацыі абавязацельстваў відаць, што рад раёнаў зусім не займаецца пытаньнямі распаўсюджваньня абавязацельстваў «Сельгасснабжэньня», і мы павінны сёньня абвясьціць гэтыя раёны, як зрываючыя справу мабілізацыі сродкаў, і папярэдне забясьпячэньне складаньмі і дэфіцытнымі машынамі, прыладамі і іншымі таварамі.

Вось гэтыя раёны: **Камарынскі, Калінкавіцкі, Рэчыцкі, Тураўскі, Заслаўскі, Плешчаніцкі, Парыцкі; Смалявіцкі; Стародарскі, Чэрвенскі, Чырвонаслабодзкі, Бягомльскі, Краснапольскі, Старабыхаўскі і Сіроцінскі.**

Але адначасова з гэтым нельга не адзначыць раёнаў, пасьпяхова выконваючых урадавае заданьне, як-то: Асіпавіцкі, Лагойскі, Крычаўскі, Менскі, ды інш.

Пры гэтым, адзін з гэтых раёнаў—Асіпавіцкі, пастановай НКЗему і Белсельгасснабу прэміраван 500 руб. за перавыкананьне кантрольнага заданьня. Зараз гэты раён энэргічна ўзяўся за выкананьне высунутага ім сустрэчнага пляну.

Гэтая абставіна і тое, што рад раёнаў наблізаецца да выпаўненьня сваіх плянаў, гаворыць за тое, што заданьні па рэалізацыі абавязацельстваў, зусім рэальныя і выпаўнімыя.

Чым-жа тлумачыцца зусім нездавальняючае выкананьне пляну?

Па першае, і галоўным чынам,—недаацэнкай гэтага пытаньня, усёй важнасьці яго, зьверху да нізу.

Матар'ялы брыгадзіраў, якія наведвалі асобныя раёны, пацьвярджаюць гэты вывад. Есьць шэраг выпадкаў, калі зацікаўленыя ўстановы і арганізацыі нават ня ведаюць, аб правадзімай кампаніі (Мсьціслаўскі р-н, Плешчаніцкі ды інш.).

Большасьць калгасаў зусім не азнаёмлены з гэтай справай, а па інфармаваньнях, зараз-жа ўтвараюць падпіску ўносяць задаткі і прымаюць наогул жывейшы ўдзел у гэтай справе.

Такім чынам адсутнасьць шырока разгорнутай работы па растлумачэньню справы рэалізацыі абавязацельстваў сярод насельніцтва—зьяўляецца другой прычынай маруднага выкананьня пляну.

Трэцяй прычынай трэба лічыць зусім недастатковае скарыстаньне цэнтральнага і раённага друку і, асабліва, раённага. Далей трэба адзначыць наступныя з прычын, маючых адмоўны ўплыў на выкананьне пляну: а) не вызначэньне прэміяльных фондаў для выдачы ўзнагароды асобным праяўшым сябе працаўнікам; б) папяровае кіраўніцтва справай рэалізацыі абавязацельстваў «СГСН» з боку спэццэнтраў, калгасна-кааперацыйнай сыстэмы, НКЗ, НКФ і інш. устаноў і арганізацый,—і ў сувязі з гэтым, недастатковая пасылка ўпаўнаважаных для практычнай работы на месцох для рэалізацыі абавязацельстваў.

Прымаючы пад увагу, што да сканчэньня кампаніі засталося ўсяго толькі 12 дзён, неабходна напружыць усе сілы на тое, каб поўнасьцю разьмясьціць па БССР абавязацельства на вызначаную суму 1.450.000 руб., бо інакш будзе зьнята частка завозу дэфіцытных тавараў і накіравана ў іншыя раёны Саюзу ССР, больш пасьпяхова выконваючых урадавае заданьне.

Трэба бездакладна пераключыцца на ўдарныя тэмпы работы і ў прыватнасьці прарабіць наступнае:

1. Райвыканкомам зараз-жа заслухаць справаздачы асобных кантрагентаў па рэалізацыі абавязацельстваў аб выніках іх работы, і мабілізаваць актыў на выкананьне кантрольнага заданьня з пасылкай яго ў калгасы і вёскі з кантрольным лічбовым заданьнем кожнаму.

2. Прыцягнуць да справы рэалізацыі абавязацельстваў камсамол.

3. Як мага шырэй скарыстаць цэнтральны і раённы друк, а таксама і насьценныя газэты.

4. Вызначыць і шырока скарыстоўваць мэтад прэміраваньня асобных актывістых у галіне правядзеньня падпіскі, у мэтах стымулюваньня астатніх працаўнікоў.

5. Прымяняць практыку эканамічнага адтрузка с-г машын і прыладаў у першую чаргу раёнам, якія выконваюць пляны рэалізацыі абавязацельстваў і акцый Трактарацэнтру) і іншага ўзьдзейнічаньня ў адносіне да раёнаў, праяўляючых бязьдзейнасьць.

6. Скарыстаць кожны выезд у калгасы і вёскі для растлумачэньня ўсёй важнасьці справы разьмяшчэньня заказаў і правядзеньня падпіскі.

У застаўшыяся 10 дзён неабходна ліквідаваць прарыў, забясьпечыць 100 проц. выкананьне пляну рэалізацыі абавязацельстваў і завоз поўнасьцю вылічанага для БССР кантынгенту складаных дэфіцытных машын і тавараў.

М. Ж.

Сарвалі рэалізацыю абавязацельстваў „Сельгасснабжэньня"

Рост калектывізацыі з кожным днём усё павялічваецца. Для таго, каб паскорыць перабудову сельскай гаспадаркі на сацыялістычны шлях, СНК СССР пастанавіў выпусьціць абавязацельства на с. г. машыны на суму 50 мільёнаў руб. Гэтыя сродкі поўнасьцю на вытворчае крэдытаваньне сельскай гаспадаркі. Аблігацыі павінны былі рэалізаваць на працягу мая і чэрвеня месяцаў. БССР вызначана па рэалізацыі кантрольная лічба ў суме 1450 тысяч руб. Даная сума разьмеркавана паміж раёнамі. Заслаўскі раён павінен рэалізаваць абавязацельстваў на 8.600 руб.

Але мы бачым, што раённыя арганізацыі па рэалізацыі машынных абавязацельстваў нічога не зрабілі. Райза, атрымаўшы дырэктыву Наркамзему, паклаў яе пад сукно, дзе яна ляжала каля двух месяцаў. Толькі 18 чэрвеня склаў Райза кантрольныя лічбы па сельсаветах, а Райкалгассаюз нават і гэтага не зрабіў. Кантрольныя лічбы па калгасах не пасланы, бо ён лічыць, што гэта не яго справа. На гэтым заслаўскія арганізацыі скончылі з пытаньнем рэалізацыі машынных абавязацельстваў «Сельгасснабжэньня».

Нават, калі выяжджалі раённыя супрацоўнікі па інш. пытаньнях, то яны пытаньне рэалізацыі абавязацельстваў не закранулі ў сельсаветах і калгасах.

Вось чаму ў Заслаўскім раёне абавязацельствы не рэалізаваны ні на капейку.

За зрыў гэтай кампаніі трэба вінаватых прыцягнуць да адказнасьці.

Падбярозкі.

У бой за торф

Саветы! па-бальшавіцку біцеся за выкананьне плянаў торфаздабычы

Саветы, дэпутацкія групы! Вы павінны стаць на чале барацьбы за Беларускі тарфяны Данбас

Саветы не павярнуліся твар да торфазаводаў

Сэзонны плян па торфаздабычы ў БССР на 15-га ліпеня, 1931 году выканаць толькі на 23,6 проц. Асобныя заводы падыходзяць да канца сэзону з надзвычайнымі прарывамі. Завод «Вялікі Мох» выканаў сэзонны плян на... 0,7 проц., завод «Вольніца» сэзонны плян выканаў на 0,36 проц., «Чырвоная Беларусь»—1,4 проц., Смалявіцкі торфа завод выканаў свой сэзонны плян на 0,9 проц., завод Рэмізава—0,43 проц., зав. «Калектыўная праца»—на 8,3 проц.

Аб прычынах прарываў на торфазаводах мы ўжо неаднойчы пісалі. Нажаль гэтыя прычыны не ліквідаваны і на сёньняшні дзень.

Шмат дзе раённыя арганізацыі і сельсаветы ня хочуць зразумець таго, што Беларусь зьяўляецца тарфяным Данбасам.

Сельсаветы і адміністрацыя торфазаводаў ня лічаць патрэбным торфарабочых забясьпечваць культурным абслугоўваньнем, не праводзяць сярод рабочых культмасавай работы (зав. «Чырвоны Сьцяг», зав. «Дукора»), у выніку чаго наглядаюцца выпадкі, калі рабочыя наладжваюць п'янкі (зав. «Чырвоны Сьцяг»).

Есьць і такія заводы, дзе адсутнічаюць ударныя тэмпы і сацспаборніцтва. Такое безадказнае становішча маецца на торфазаводзе Грэбнёва. На гэтым заводзе быў такі выпадак, калі брыгады Маркава і Ценсевіча выканалі свае заданьне не параўнаўча больш чым другія брыгады—на 90%, але прафсаюзныя і партарганізацыі заводу не палічылі патрэбным перакінуць іх вопыт у іншыя брыгады. Больш таго, маюцца выпадкі простага злачынства. На торфазаводзе «Шлях Сацыялізму» прапановы рабочых і на сёньняшні дзень не знайшлі свайго ажыцьцяўленьня,—ляжаць у стале тэх нарука. Гэта тады, калі ёсьць шмат прапаноў, якія-б паскорылі выпрацоўку торфу. На гэтым заводзе ёсьць арцелі, якія ня маюць свайго прамфінплану.

Магілеўскім раённым арганізацыям даўно вядома аб прарывах на торфазаводах Магілеўскага раёну, але райпрафсавет і гарсавет ніякай дапамогі заводам на даў, гэтыя арганізацыі зусім ня цікавяцца работаю торфазаводаў.

Дзённая зводка

па выпрацоўцы торфу на найбольш буйных торфазаводах БССР на 15-га ліпеня 1931 году

НАЗВА ЗАВОДАЎ	Процант выканан. пляну
1. „Бальшавік"	71,0
2. Грэбнёва	54,6
3. Давыдўка	82,5
4. Закрашынскі мох	71,6
5. „Чырвоны Тарфянік"	107,1
6. „Чырвоны Кастрычнік"	66,8
7. „Ленінскі Шлях"	11,7
8. Асінторф	43,1
9. „Шлях Сацыялізму"	68,6
10. „Свабода"	36,9

Яшчэ горш абстаіць справа ў Вульскім раёне. З боку РВК ніякага няма садзейнічаньня тэхнэрсаналу. Старшыня райвыканкому таў. Зраўйкоўскі адмовіўся ад рэгістрацыі «статутаў ужо працуючых торфаарцеляў калгасьнікаў».

Наглядаюцца выпадкі калі самі калгасы (імя Крупскай, імя Калініна, Хоцімскі) узялі ў свае вытворчыя пляны торфаработу, але не вылучаюць для гэтае работы рабочых.

Таксама зьяўляецца тормазам у выкананьні тарфянога прамфінпляну і тое, што на многіх заводах недастатко ва наладжана харчаваньне. На заводзе «Шлях Сацыялізму» прадуктаў многа, але іх несвая часова дастаўляюць у сталовую, вараць з іх абеды дрэннай якасьці. Ня лепш абстаіць справа з харчаваньнем у торфаарцелях Полацкага раёну, на торфазаводзе «Чырвоны Сьцяг» (Смалявіцкі раён) і інш.

Усе гэтыя факты знаходзяцца па-за ўвагаю як раённых арганізацый, так і сельскіх саветаў. Дэпутацкія групы разам з насьценгазэтамі і шматтыражкамі (дзе яны ёсьць) павінны неадкладна на павярнуцца тварам да работы торфазаводаў, яны павінны наладжваць пэрыядычныя рэйды па праверцы работы нізавых сэкцый саветаў. Толькі пры такіх умовах мы дапаможам саветам эрабіцца сапраўднымі кіраўнікамі гаспадарча-палітычнага жыцьця раёну.

Т. Алесін.

Ударная брыгада ІТР будматар'ялаў выканае ўзятыя на сябе абавязацельствы

15 ліпеня г. г. адчыніўся 1-шы ўсебеларускі зьезд ІТР прамбудматар'ялаў.

Зьезд прывіталі рабочыя цагельных заводаў Будаб'яднаньня і Менбуду. У сваіх прывітаньнях рабочыя падкрэсьлівалі, што маючыся прарыў трэба і магчыма ліквідаваць, і што ўдарнымі мэтадамі працы, сацспаборніцтвам, штурмавой працай у III-м квартале гэтага сэзону, яны выканаюць прамфінплян.

Ад імя канторы «Будматар'ял» зьезд прывітаў кіраўнік канторы т. Рабінін. Ад газэты «Савецкая Беларусь» з прамовай выступіў т. Маркаў, які падкрэсьліў, што на падставе прамовы т. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў адносны да спэцыялістаў і адносны спэцыялістаў да працы павінны павярнуцца на новыя рэйкі; трэба працаваць па новаму, як патрабуюць зараз ад ІТР новыя ўмовы. Маючыся прарыў на заводах вырабляючых будматар'ял трэба і можна зьнішчыць толькі шляхам ударных брыгад, сацспаборніцтвам, пераходам на гаспадарчы разьлік, ліквідаваўшы абязьлічку, аўдараным тэхнікай.

Зьезд прывітаў прадстаўнік прэзыдыуму Бел СВІТ'у т. Альтшулер, які выразна падкрэсьліў, што ў нашых радох ІТР ня можа быць нэўтральных, апалітычных людзей. Трэба сумленна адносіцца да сваіх абавязкаў і ня толькі прымаць прыгожыя рэзалюцыі, але паказваць працу.

З дакладам аб чарговых задачах ІТС па прамбудматар'ялах выступіў старшыня Аргбюро Р. Б. ІТС т. Канэльсон.

Зьезд заслухаў даклад рэспубліканскай прамысловасьці будматар'ялаў. Даклад зрабіў кіраўнік канторы «Будматар'ял» т. Рабінін.

Ад мясцовай прамысловасьці ВСНГБ, ад якой зьезд павінен быў таксама заслухаць даклад—ніхто не зьявіўся нават... даклад ніхто не зрабіў.

Зьезд паслаў прывітальныя тэлеграмы ЦК КП(б)Б, ЦК Саюзу Прамбудматар'ялаў і ЦБ ІТС Прамбудматар'ялаў, у якой заявяе партыю, саюз і Цэнтральнае Бюро ІТС, што ўзятыя на сябе абавязкі па ліквідацыі прарыву, укараненьні тэхнікі ў масы, правядзеньні ў жыцьцё справы, намечанай у прамове т. Сталіна, будуць выкананы.

Зьезд абраў пленум са складам 11 асоб і прэзыдыум пленуму—Рэспубліканскае Бюро ІТС прамбудматар'ялаў з 5-ці асоб. У Рэспубліканскае Бюро ўвайшлі: Канэльсон Р. Н. (старшыня Р. Б. ІТС), Мінчанка (адказн. сакратар Р. Б.), Мешкоў (сакрат. Р. Б.), Сабалеўскі (адказны сакратар саюзу прамбудматар'ялаў—член Р. Б.) і т. Даніловіч (член Р. Б.).

Зьезд абвясьціў сябе ўдарнай брыгадай ІТР па будматар'ялах Савецкай Беларусі, узяўшы на сябе ўсе абавязацельствы, каб зьліквідаваць ганебны прарыў, які атрымаўся на прамысловасьці будматар'ялаў да гэтага часу.

Эрэнка.

О. Канакоцін

ЛІТАРАТУРУ НА СЛУЖБУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАМУ БУДАЎНІЦТВУ*)

II. За пагранічнымі слупамі

„На перакор ўсім прароцтвам буржуазных і сацыял-дэмакратычных песьняроў капіталістычнай стабілізацыі, на перакор іхнім правым і трацкісцкім падгалоскам, капіталістычны сьвет перажывае пэрыяд нябывалага прамысловага і аграрнага крызісу... і далейшага рэвалюцыянізаваньня мас» ¹). Там крызіс, у нас завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

За апошнія два гады вытворчасьць у радзе капіталістычных краін зьнижецца ў два разы, а ў СССР за гэтыя-ж гады павялічваецца амаль у два разы. Там, за пагранічнымі слупамі—армія беспрацоўных папаўняецца ўсё новымі і новымі мільёнамі прыгаворных на галодную сьмерць рабочых, якім няма работы ў краінах капіталу; дзе нястрымны працэс паўпэрызацыі сялянскіх мас; праводзіцца рабаўніцтва працоўных надзвычайнымі падаткамі; масавыя расстрэлы дэманстрацый, разгул фашысцкіх банд, жудасныя зьдзекі і катаваньне ў турмах зьяўляюцца найлепшымі адзнакамі цывілізацыі капіталістычных краін.

Яскравым прыкладам капіталістычнай «стабілізацыі» і «правільнасьці» тэорыі арганізаванага капіталізму зьяўляецца наша бліжэйшая, «найкультурнейшая» суседка «Жэч Посполіта Польска». Польшча зьяўляецца краінай, дзе найбольш яскрава выявіўся сучасны эканамічны крызіс капіталізму. Беспрацоўе расьце з кожным днём. Ужо зараз налічваецца каля мільёну беспрацоўных, з якіх толькі 120 тыс. атрымліваюць пэнсію ў памеры 30 проц. месячнага заробку (афіцыйна зарэгістравана 370 тыс. беспрацоўных). Тыж-ж хто працуюць кожны дзень стаяць пад пагрозай быць выкінутымі за вароты фабрыкі, альбо на наступную раніцу атрымаць новае зьнижэньне заработнай платы, так па цэлым радзе прадпрыемстваў Лодзі, Бельску, Прымор'я зарплата зьнижана на 7—20 проц. «У найгоршым становішчы знаходзяцца сельска-гаспадарчыя рабочыя, агульна лічба якіх (разам з сэзонынікамі і дзяцьмі рабочымі) дасягае аднаго мільёна восемсот тысяч, і якія атрымліваюць у сярэднім па 2-3 злотых у дзень» ²). Прамысловы крызіс мае сталага спадарожніка—аграрны крызіс, пераплятаючыся з аграрным крызісам паскарае працэс паўпэрызацыі мас сялянства. Трэба памятаць яшчэ і такія «дэталі фашыстаўскай аграрнай палітыкі, як камасацыя, насаджэньне асадніцтва, жудасных памераў падаткі і ў дадатак да гэтага, добра вядомую Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне сыстэму карных экспэдыцый, «славутую» дзейнасьць дэфэнзывы і г. д., каб увяць сабе паўнату карціны становішча Польшчы.

Польскі фашызм імкнецца затрымаць працэс распаду сваёй культуры, праводзячы фашызацыю школы, друку, мастацтва, літаратуры, выбіваючы ўсё тое, што можа паслабіць дыктатуру фашызму. Культура буржуазіі нясе шырокія масам прыгнечаньне, нязпісьменнасьць, рэлігійныя забабоны і ўсе іншыя «прыгожасьці» капіталізму. І той, хто падымае свой голас супроць іх і іх культуры пападае ў прыдатак польскай цывілізацыі—дэфэнзыву. Так было з заходня-ўкраінскімі і заходня-беларускімі культурнымі дзеячамі.

Прамысловы і аграрны крызіс Польшчы вядзе да распаду ўсяго гаспадарчата і культурнага жыцьця, нябачна паглыбляе клясавыя супярэчнасьці, даючы новыя рэвалюцыйныя зрухі ў масах рабочае клясы і эксплёатаемага сялянства. Расьце хваля забастовак. Дэманстрацыі амаль заўсёды праходзяць у бойках з паліцыяй, рэвалюцыйны рух беспрацоўных узьняўся на больш высокі ўзровень, сялянскія масы выступаюць з вялікай актыўнасьцю, праўда рэвалюцыйныя выступленьні сялянства праходзяць не заўсёды арганізавана, тут яшчэ пераважае стыхійнасьць. Нацыянальна вызваленчы рух у Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне пераходзіць у масавыя народныя выступленьні супроць фашыстаў. У гэтых выступленьнях «упяршыню за некалькі год праявіліся элемэнты грамадзянскай вайны. Гэта быў адзін з буйнейшых удараў па польскім імпэрыялізьме і яго антысавецкіх вайсковых плянах, а таксама адзін з найбольш яскравых сымптомаў насьпяваньня тэндэнцыі рэвалюцыйнага крызісу ў Польшчы» ¹).

У справе паказу крызісу капіталізму, паказу поступу пралетарскага рэвалюцыйнага руху, у справе ўмацаньня інтэрнацыянальнай салідарнасьці пралетарыяту і працоўных Савецкага Саюзу з замежнымі братамі па клясе—творчае вока савецкіх пісьменьнікаў павінна бачыць далей пагранічных слупоў і ахопліваць абшары па-за слупамі, дзе з нябачнай мужнасьцю, ідзе змаганьне пралетарыяту і працоўных з прыгнечаньнем капіталу, з прыгнечаньнем крывавага фашызму—змаганьне за Кастрычнік на Захадзе. Тут трэба адзначыць, што з выкананьнем гэтай ролі

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену разьдзелу III і арт. арт. 131 і 152 Папраўна-працоўнага кодэксу і пра скасаваньне разьдзелу IV гэтага кодэксу

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР—пастанаўляюць:

1. Разьдзел III Папраўна-Працоўнага Кодэксу БССР запісаць у наступнай рэдакцыі.

«Разьдзел III.

НАГЛЯДАЛЬНЫЯ КАМІСІІ

11. Пры кожным месцы зьняволеньня ўтвараюцца наглядальныя камісіі.

Наглядальныя камісіі складаюцца з народнага судзьдзі таго раёну, дзе знаходзіцца данае месца зьняволеньня (старшыня камісіі) і членаў—прадстаўнікоў ад адміністрацыі месца зьняволеньня, Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі, арадзкіх саветаў і прафсаветаў.

Пры вырашэньні спраў вайскоўцаў з правам пастаноўчага голасу ў наглядальнай камісіі ўдзельнічае прадстаўнік Вайсковага Трыбуналу.

У пасяджэньнях наглядальных камісій абавязкова ўдзельнічае з правам дарадчага голасу пракурор альбо яго памочнік. Пры вырашэньні спраў вайскоўцаў, на пасяджэньнях камісіі ўдзельнічае прадстаўнік Вайсковай Пракуратуры.

На пасяджэньнях наглядальных камісій могуць удзельнічаць з правам дарадчага голасу народныя заседацелі, прадстаўнікі прафэсыйных арганізацый, ЛКСМБ, жаночых арганізацый і іншых.

12. На наглядальныя камісіі ўскладаецца:

а) нагляд за ажыцьцяўленьнем выразнай клясавай палітыкі і належнага рэжыму ў дачыненьні да сацыяльна-варожых элемэнтаў;

б) нагляд за ажыцьцяўленьнем прымусова-выхаваўчага ўзьдзейнічаньня на зьняволеных працоўных;

в) абмеркаваньне прапаноў адміністрацыі месц зьняволеньня аб арганізацыі работ, палепшаньні быту зьняволеных, культурна-выхаваўчай работе, змаганьні з самавольнымі адлучкамі зьняволеных і інш.;

г) пераводзі зьняволеных з аднэй катэгорыі ў другую;

д) дача адпускоў тым зьняволеным з працоўных, якія адбылі ня менш ⅓ вызначанага ім тэрміну пазбаўленьня волі і выявілі сябе на вытворчай рабоце;

е) вырашэньне пытаньняў аб залічэньні зьняволеным аднаго дня работы за 3 дні пазбаўленьня волі, у адпаведнасьці з арт. 131;

ж) умоўна-датэрміновае вызваленьне пасьля адбыцьця ўстаноўленага мінімальнага тэрміну тых катэгорый зьняволеных з працоўных, якія па характару ўчыненага імі дзеяньня не зьяўляюцца сацыяльна-небясьпечнымі і за час знаходжаньня ў папраўна-працоўнай установе выявілі сябе з станоўчага боку на рабоце;

з) разгляд заяў зьняволеных аб неправільных дзеяньнях адміністрацыі мейсц зьняволеньня, а таксама ўзьніманьне перад належнымі органамі пытаньня аб скасаваньні няправільных пастаноў адміністрацыі мейсц зьняволеньня;

і) узьніманьне перад адпаведнымі органамі пытаньняў:

1) аб замене ўтрыманьня пад вартай іншай больш лёгкай мерай сацыяльнай абароны (прымусовымі работамі і інш.) у дачыненьні да тых зьняволеных працоўных, утрыманьне якіх у месцах зьняволеньня зьяўляецца немэтазгодным;

2) аб пераводзе зьняволеных з аднаго месца зьняволеньня ў іншае;

3) іншых пытаньняў, якія ўзьнікаюць у практыцы работы наглядальных камісій.

13. Пастановы наглядальных камісій зьяўляюцца канчатковымі. Пастановы камісіі аб умоўна-датэрміновым вызваленьні і залічэньні працоўных дзён, могуць быць апратэставаны Пракурорам на працягу дзесяці дзён у той народны суд, у раёне дзейнасьці якога знаходзіцца данае месца зьняволеньня, прычым у разглядзе пратэстаў прымае ўдзел народны судзьдзя, які не старшынствуе пры разглядзе гэтай справы ў наглядальнай камісіі. Пастановы суду зьяўляюцца канчатковымі.

Пратэст Пракурора прыпыняе выкананьне пастановы наглядальнай камісіі да вырашэньня пытаньня судом.

14. Наглядальныя камісіі абслугоўваюцца тэхнічным апаратам месц зьняволеньня.

15. Агульнае кіраваньне работаю наглядальных камісій ажыцьцяўляецца Народным Камісарыятам Юстыцыі.

16. Разьмеркаваньне зьняволеных па месцах зьняволеньня ажыцьцяўляецца Кіраўніцтвам Месц Зьняволеньня Народнага Камісарыяту Юстыцыі.

17. Наглядальныя камісіі пэрыядычна робяць справаздачы аб сваёй дзейнасьці мясцовым саветам, раённым выканаўчым камітэтам, Народнаму Камісарыяту Юстыцыі і перад шырокімі масамі працоўных.

II. Разьдзел IV Папраўна-Працоўнага Кодэксу скасаваць.

III. Арт. арт. 131 і 152 Папраўна-Працоўнага Кодэксу запісаць у наступнай рэдакцыі:

«131. Праца абавязкова для ўсіх працаздольных зьняволеных, і адміністрацыя месц зьняволеньня павінна ўжываць усе захады да таго, каб усе здольныя да працы зьняволеныя былі заняты работамі.

Вядзеньне зьняволеных з працоўных прадукцыйнае работы і набыцьцё імі прафэсійных ведаў, якія сьведчаць аб прыставаньні зьняволеных да ўмоў працоўнага супольнага жыцьця, захвочваецца пастановамі наглядальных камісій, залічэньнем аднаго дня работы за тры дні пазбаўленьня волі, пры чым залічвацца могуць усе адпрацаваныя дні, а таксама і частка іх.

Увагу да арт. 131—скасаваць.

«152. Прыбытак ад вытворчых работ у майстэрнях разьмяркоўваецца наступным парадкам:

а) 10 проц. адлічаецца ў фонд для палепшаньня быту рабочых і служачых месц зьняволеньня і прымусовых работ, на палепшаньне ўтрыманьня зьняволеных і выдачу ім дапамогі пры вызваленьні іх з месц зьняволеньня;

б) 90 проц. залічаецца ў адзіны фонд самаакупаньнасьці месц зьняволеньня, які выдаткоўваецца на ўтрыманьне месц зьняволеньня і на пашырэньне вытворчасьці».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гнілякевіч.**

5 ліпеня 1931 г.

Менск

Забясьпечыць адкорм жывёлы на пашы

Адкорм жывёлы на траве зьяўляецца магутным сродкам у павялічэньні мясного балянсу. Ён пры добрай пашы і выкананьні элемэнтарных заэтэхнічных патрабаваньняў дае вялікую эфэктыўнасьць.

Аб праўільным правядзеньні нагульных апэрацый Белмяса, а таксама іншыя арганізацыі своечасова разаслалі на месцы інструкцыі для непасрэднага кіраваньня, але нажаль мясцовыя работнікі ў большасьці ею ня карыстаюцца. Калі спытаешся ў аддзяленьні Белмяса або Райкаапсаюзе, ці праводзіцца наогул па ўказаньнях прадугледжаных інструкцыяй, ці ведае пастух аб тэхніцы нагулу, каб праз тры месяцы адпасу атрымаць належны эфэкт, мясцовыя работнікі адкажуць: «Так, ёсьць інструкцыя, яна ляжыць у нас тут недалёка», і з паўгадзіны будуць шукаць яе ў справах, дзе яна валяецца непрачытанаю, нерастлумачанаю пастухам.

Нагул мяса жывёлаю на летнім выпасе ёсьць кампанія, якую патрэбна праводзіць па-ўдарнаму. У сапраўднасьці нагульная кампанія не ўдзяляецца належнай увагі. Звычайна загадчыкі аддзяленьняў Белмяса даручаюць зрабіць адбор жывёлы на нагул сваім пэшкам. Прыёмшчык мог-бы з посьпехам выконаць даручаную яму справу, калі-б узяў інструкцыю і пачытаў, якая жывёла падыходзіць да нагулу. Пры праверцы некалькіх нагульных пунктаў Белмяса, дзе жывёла лічылася адабраная на нагул, прышлося забракаваць больш 100 галоў, якія аказаліся няпрыгоднымі для нагулу мяса. На Чавускім пункце заўважана шмат выпадкаў няўважлівага догляду за жывёлай. Напрыклад, путы на нагах кароў разбракаюць ад макраты і ўядаюцца аж да касьці. У Мазырскім аддзяленьні Белмяса старшы агент перад праверкаю адабранага ім на нагул гурту жывёлы заверыў, што лепш за яго адабраць жывёлу ніхто ня зможа. У сапраўднасьці аказалася, што ў гурце ёсьць каровы бяз зубоў.

Наогул у час праверкі і пастаўкі жывёлы на нагул на чатырох пунктах Белмяса і адным райкаапсаюзе выявілася, што выпасныя вучасткі адведзены добрыя, але перадача іх Белмясу не аформлена. У Жлобінскім раёне на гурт адведзена столькі пашы, што яе ня хопіць ня толькі на адкорм, але нават і на нератрымку жывёлы. У Быхаўскім аддзяленьні Белмяса ні загадчык аддзяленьня, ні гуртпраў, ні пастухі ня ведаюць межаў выпаснага вучастку; плошча выпасу на вучастку не разьбіта. На Чавускім нагульным вучастку, прызначаным для мясной жывёлы пасьвіцца жывёла ўсяго вакольнага насельніцтва.

Тырлы (месцы для адпачынку жывёлы ўдзень і ўночы) абраны кепскія. Напр. у Быхаўскім нагульным пункце жывёла на дзённы адпачынак ставілася ў яму, у той час як побач з ямаю маецца пруд, які трэ' было абгарадзіць, каб паставіць жывёлу на дзённы адпачынак. На Мазырскім нагульным пункце пастаўлены разам быкі, каровы і цяляты, прычым быкі не даюць адпачынку ўсяму гурту. На Чавускім нагульным пункце, пасьля месячнай пасьбы прышлося нанова пераважваць усю жывёлу, каб скласьці на яе акт, бо пры пастаўцы акту не злажылі.

Наём рабочай сілы нідзе не аформлен калдагаворамі, прамфінплян не даведзен да кожнага пастуха.

Ёсьць яшчэ шмат недахопаў у доглядзе за жывёлай. Так, гурты не забясьпечаны быкамі, на тырле няма слупоў дзеля часаньня жывёлы, соль для ўзбуджэньня апэтыту не даецца, аптэчак з неабходнымі мэдыкамэнтамі няма.

Трэба канстатаваць, што калі гэтак будзе і надалей праводзіцца нагул жывёлы, дык заданьне ўраду аб атрыманьні належнага прыросту жывой вагі выканана ня будзе. Дапусьціць гэтага ні ў якім разе нельга.

Апроч таго, на посьпехі работы адбіваецца і тое, што спажыўкаапэрацыя ўсякімі спосабамі ,ледзь ня ўмыслова ,зрывае забясьпечаньне пастухоў харчамі.

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва сярод пастухоў няма. Толькі пасьля правядзеньня належнай работы пастухі Мазырскага нагульнага пункту абвясьцілі сябе ўдарнікамі і выклікалі на сацспаборніцтва нагульны пункт Мазырскага райкаапсаюзу і Магілеўскі, Быхаўскі і Чавускі нагульныя пункты Белмяса, абавязаўшыся даць прырост жывой вагі жывёлы 17,5 проц., замест прадугледжанага плянавага заданьня 15 проц.

Справе летняга адкорму жывёлы надаць належнае значэньне.

Мясцовыя арганізацыі ,якія маюць дачыненьне да правядзеньня нагулу, павінны аддаць максымум увагі нагульнай апэрацыі.

А. Суравец.

Зрываюць плян загатовак

Любаньскі райкаапсаюз паводле пляну на гэты год павінен загатовіць 1.500 шт. птушак і 90 скрынак яек. Але Любаньскі райкаапсаюз ня дбаў пра гэту загатоўку. У выніку райкаапсаюз сарваў загатоўку яек і птушак за першае паўгодзьдзе.

Да 1-га ліпеня ня выканана заданьне па яйках (замест 90 скрынак--6 скрынак, або 6,5 проц.), а па птушках замест 1.500 выканана 36 шт., або 2,5 проц. пляну.

Надыходзіць новы сёзон па гэтай загатоўцы, а да Любаньскага райкаапсаюзу і зараз гэта не датычыцца.

Райкаапсаюз ,ня гледзячы на зрыў гэтых загатовак за першае паўгодзьдзе, таксама і да новага надыходзячага сэзону другога паўгодзьдзя зусім ня рыхтуецца.

С. Кацнэльсон.

Дэкада агляду перабудовы каапэрацыі

НА МЕРТВАЙ КРОПЦЫ

Пастанову партыі і ўраду Бабруйскі ЦРК лічыць для сябе неабавязковай

Марудна праходзіць перадача крам галінным аб'яднаньням. Не адчынена ніводнай новай крамы. Нічога ня зроблена ў рэарганізацыі сыстэмы зарплаты. Чаргі—звычайнае зьявішча нават у закрытых разьмеркавальніках

Перавесьці перабудову спажыўкаапэрацыі на ўдарныя бальшавіцкія тэмпы

Усім гар. і райКК-РСІ

Прыступеце неадкладна сумесна зпрафсаюзамі і пракуратурай да праверкі дырэктывы вышэйшых органаў аб спыненьні прымусовага асартымэнту ў продажы каапэрацыйнымі, дзяржаўнымі, гандлёвымі арганізацыямі. Таксама праверце, ці няма фактаў засылкі на пэрыферыю непатрэбных тавараў.

У выпадку выяўленьня падобных фактаў, прыцягнеце вінаватых да суровай партыйнай і судовай адказнасьці.

Першая інфармацыя аб выніках праверкі павінна быць дасланa не пазьней 27-га ліпеня.

Нам. старшыні ЦКК КП(б)Б і Наркома РСІ БССР ІВАНОЎ.

Чарапашыя тэмпы павінны быць зжыты

Перабудова работы каапэрацыі ў адпаведнасьці з адозвай ЦК, СНК і Цэнтрасаюзу не набыла яшчэ ва ўмовах Бабруйску належных бальшавіцкіх тэмпаў. Каапэрацыйныя арганізацыі, у прыватнасьці, Бабруйскі ЦРК не забясьпечыў гэтай адказьнейшай рабоце належнай увагі. Работа праходзіць самацёкам.

Возьмем пытаньне гаспадарчага разьліку. Па сэктары забясьпячэньня пляны забясьпячэньня ня поўнасьцю ахоплены дагаворамі. Апрача таго, гэтыя дагаворы маюць вялікія недахопы ў тым, што ў радзе дагавораў не паказаны нават тэрміны дастаўкі тых ці іншых тавараў, не агаворана якасьць гэтых тавараў.

Недапусьціма па бюракратычнаму аднёсься да пытаньня заключэньня дагавораў з Бабруйскім ЦРК і сам Белкаапсаюз. Ён то павінен быў паказаць прыклад сапраўднай работы ў гэтым напрамку, а на самой справе аказалася, што дагаворы, прысланыя з Белкаапсаюзу, маюць надзвычайную няяснасьць, якая ставіць у цяжкія ўмовы работы каапэрацыйныя арганізацыі.

У дагаворох на пастаўку тавараў Белкаапсаюз нават не агаворвае таго, якія тавары ён павінен пастаўляць. У дагаворох ёсьць толькі агульныя назвы тавараў: трыкатаж, абутак і г. д. Разьмежаваньня-ж па гатункох гэтых тавараў—няма і ў паміне. Зразумела, што пры такой пастаноўцы дагаворнай работы каапэрацыйныя арганізацыі ня могуць быць упэўнены ў нармальным забясьпячэньні.

Наладжваньне кантролю за выкананьнем заключаных дагавораў, якому здозва аддае надзвычайна вялікую увагу, у Бабруйскіх каапэрацыйных арганізацыях не практыкуецца. Мы маем рад фактаў сыстэматычнага нявыкананьня дагавораў як па лініі Белкаапсаюзу, так і па лініі іншых арганізацый. Так, напрыклад, Белкаапсаюз замест завозу трыкатажных тавараў на 34 тысячы рублёў, завёз іх толькі на 25 тысяч рублёў. Такое самае недавыкананьне дагавораў ёсьць з боку Белкаапсаюзу і ў іншых галінах забясьпячэньня. Арцелі, якія згодна дагавораў павінны забясьпечваць ЦРК розными вырабамі, таксама ня выконваюць сваіх абавязкаў, а супроць гэтых недапушчэньных зьявішчаў ня прымаецца належных мер. Належнага кантролю рублём у гэтай справе няма.

Праўленьне ЦРК недапушчальна нядбайна аднеслася да пераводу крам на гаспадарчы разьлік. Фармальна гэтая работа як быццам праведзена, а на самой справе крамы ня ведаюць вынікаў сваёй работы з тае прычыны, што вучот іх дзейнасьці не наладжаны. Ня складзены яшчэ і гандлёвы плян на III квартал.

Недапушчальна марудна праходзіць перадача крам ЦРК галінавым аб'яднаньням. Па пляну, па Бабруйску павінна быць перадана такіх крам 9. На сёньняшні дзень перадана толькі тры, пры чым гэтая перадача праведзена надзвычайна фармальна, без належнага забясьпячэньня кіраўніцтва работай крам і забясьпячэньня іх тавараміі. Пераданыя крамы ня ведаюць на якім яны сьвеце знаходзяцца, не атрымліваюць ніадкуль тавараў і працуюць надзвычайна кепска, ня маючы належнага асартымэнту тавараў.

Да адчыненьня новых магазынаў па Бабруйску яшчэ, не прыступілі ня гледзячы на тое, што іх павінна быць адчынена 10.

У галіне рэарганізацыі сыстэмы заработнай платы да гэтага часу нічога ня зроблена. Апарат ЦРК ня ведае аб новых формах заработнай платы. Сыстэма прэміраваньня і сытэма зарплаты ў залежнасьці ад перавыкананьня гандлёвага пляну не ўстаноўлена. Гэтым пытаньнем пакуль што не займаліся.

Некаторую работу прарабіў Бабруйскі ЦРК у галіне падрыхтоўкі кадраў. Арганізаваны курсы працаўнікоў прылаўка, курсы кухароў, але надзвычайна кепска пастаўлена вытворчая практыка гэтых курсантаў. Часта курсантаў скарыстоўваюць не на той працы, якая ім павінна давацца, а проста ў якасьці вартаўнікоў, або чорнарабочых.

Цэрабкопам не аддана належнай ўвагі рэалізацыі адозвы ў пытаньнях барацьбы з чаргамі. Гэтыя чаргі нават у закрытых разьмеркавальніках—звычайнае зьявішча. Работа закрытых разьмеркавальнікаў не падпарадкавана ўмовам працы рабочых. Рабочыя адзіночкі або тыя члены, сем'і, якія занятыя на працы, ня могуць атрымаць тавараў у закрытым разьмеркавальніку, бо гэтае разьмеркаваньне праходзіць у парадку жывой чаргі.

Неналаджанасьць грамадзкага харчаваньня, кепская наладжанасьць забясьпячэньня ўдарнікаў дапаўняе малюнак становішча перабудовы работы Бабруйскага ЦРК у адпаведнасьці з тымі задачамі, якія ставіла перад ім адозва ЦК, СНК і Цэнтрасаюзу.

Гэтае становішча патрабуе рашучага ўзмацненьня тэмпу перабудовы, большай уважлівасьці з боку праўленьня ЦРК гэтаму пытаньню, большай актыўнасьці ў правядзеньні работы па перабудове. Чарапашыя тэмпы павінны быць рашуча зжыты. Дзяжнік праверк павінен даць рашучы пералом у гэтай справе. Бязьдзейнасьці павінен быць пакладзены канец.

Брыгада «Сав. Беларусі», «Камуніста» і «Акцябра»: **Дамброўскі, Рубіштэйн, Рубенчык, Пагоскін, Матлін, Марчанка, Бухштабэр, Фрадкін.**

Соль ляжыць на гнаі на двары Ігрушацкага Сельпо.

Падрыхтоўка хавальнікаў пад пагрозай

Аршанскі ЦРК па пляну павінен хаваць каля 2.000 тон гародніны. Аршанскае ТПО—каля 2.500 тон. Ня гледзячы на тое, што праз месяца паўтара пачне паступаць гародніна, ні ЦРК, ні ТПО не падрыхтаваліся да сустрэчы гародніны. Дастаткова сказаць, што Аршанскі ЦРК нават не паклапаціўся выявіць маючыяся па горадзе падвальныя памяшканьні. Працаўнікі, якім гэта было даручана, у мэтах самаэкаўкі вызначылі для хаваньня толькі 8 памяшканьняў, прыкладна на 700 тон гародніны, указаўшы праўленьню, што больш хавальнікаў у горадзе няма. Праўленцы сьлепа даверыліся гэтаму і пачалі дабівацца перад Белкаапсаюзам, каб ён адпусьціў сродкі на пабудову новых гародных хавальнікаў. Брыгада сэктара праверкі Наркамснабу БССР правяла абход толькі двух вуліц і знайшла больш чым на 700 тон новых хавальнікаў. Толькі тады праўленьне ЦРК упэўнілася, што яно было ўведзена ў заблуджэньне сваімі работнікамі.

Па кантрольных лічбах ЦРК павінен сабраць авансаў на гародніну на 20.000 руб., ТПО на—15.000 руб. ЦРК зусім ніякіх вестак ня мае, як ідзе збор, а ТПО сабрала ўсяго 60 руб. Трэба сказаць, што Гарпрафсавет мала цікавіцца ходам падпіскі на гародніну.

ЦРК нічога не зрабіў для падрыхтоўкі буртаваньня бульбы. Ніякіх крокаў ня прынята для мабілізацыі ўвагі загадчыкамі сталовак на неабходнасьць забясьпячэньня сталовак памяшканьнямі для хаваньня гародніны на ўвесь сэзон.

У ТПО пакуль чакаюць гроші з Масквы для пабудовы хавальнікаў. Нічога ня зроблена для падшуканьня памяшканьняў на тэрыторыі калгасаў і вугчкі.

Неабходна зараз-жа ўзяць на вучот усе падвальныя памяшканьні гораду. ЦРК і ТПО павінны неадкладна вылучыць групы працаўнікоў-спэцыялістаў, якія павінны аглядзець усе памяшканьні ў тэрміновым парадку. Неабходна тэрмінова прыступіць к рамонту з тым, каб не пазьней 20-га ліпеня хавальнікі былі падрыхтаваны.

Гарпрафсавет павінен правесьці дэкаду папярэдняй падпіскі на гародніну, а Гаржыласюз—на зборы тары ў ЖАКТ'ах. Загадчыкі сталовак павінны дастаць памяшканьні для хаваньня гародніны на ўвесь сэзон. Яны павінны несьці адказнасьць за гэту работу.

Брыгада «Сав. Бел.» і сэктару праверкі Наркамснабу БССР: **Левін, Егудэсман, Купрэвіч.**

Аб „дробязі" запамятавалі

Усім вядома, што прыгарадная гаспадарка павінна быць забясьпечана вадой: статак, гарод і асабліва сталоўка патрабуюць шмат і прытым якасна добрай вады.

Нажаль ,аб гэтай «дробязі» нашы каапэратары МІРК і адміністрацыя саўгасу імя Лекерта «запамяталі». У саўгасе да гэтага часу не пабудавана яшчэ студня, якая задавальняла-б усе запатрабаваныя гаспадарчыя вадзе (старая студня стала непрыгоднай, заплыла брудам, вада запахла). Зараз вада дастаўляецца з рэчкі і крыніцы ў бочках, што марудзіць падвозку ў горад. У сталоўку вада бярэцца з рэчкі, дзе плаваюць нечыстоты. Там-жа мыюць бялізну. Былі выпадкі, калі прынесеная вада з рэчкі ў сталоўку стаяла там суткі і тады скарыстоўвалася. Але новай студні ня будуюць.

У той час, як саўгас мае разам з маладняком 200 галоў статку і вялікую сталоўку на 300 чалавек, дзе вады патрэбна шмат, яе няма.

Брыгадзір.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Калектыў супрацоўнікаў і мясцком Народнага Камісарыяту Асьветы БССР выражаюць сваё глыбокае спачуваньне кансультанту мэтадкому, старшыні мясцкому НКА тав. Ю. Б. Пракашка — з прычыны

нечаканай сьмерці яго жонкі

Калектыў супрацоўнікаў і МК НКАсьветы

ЦЫРК-КІНО-ТЭАТР

Мендзяржтэатр — СЁНЬНЯ гастроль расійскай опэры пад кіраўніцтвам Я. Е. Воўкава. ФАУСТ (с Вольп. ночью). Муз. Гуно. Пачатак а 8 з паловай гадз. Білеты ў раб. касе з 12-2 і з 4-6 г. У касе тэатру з 12-2 і з 5-9 гадз. увеч.

Дзяржцырк — СЁНЬНЯ ВЯЛІКІ ДНЯЎНЫ ПАКАЗ. Пачатак а 2 газзіне. ВЕЧАРАМ. Гастроль эўрапэйскіх артыстаў люзіністаў МАРЧЭС. Дэбют адзінай у СССР трупы акрабатаў сальтоморталістаў Д. Донвальдзі. Гастроль—ПЯЦЬ ЗЯРНАЎ—музычны акт. Першы раз навіна Захаду—аўтамат-лялька—Фрозо. Працягваюцца гастролі валёсыпэдыстаў-фігурыстаў—ПЯЦЬ ПОЛЬДЗІ. Працяг гастроляў нямецкага атракцыёну 6—РЭДАМ—6. Вывэд жокея-наездніка АЛЕКСАНДРА. Стайня пад кіраўніцтвам А. В. Лапіда. Пачатак гастроляў эквілібрыстаў НАВАРО. Пачатак а 8 гадз. 45 хв. увечары. Льготныя білеты ў рабкасе

Дом культуры — Гастролі 1-га Дзяржаўнага Польскага Тэатру Украіны. 20, 21 і 22 ліпеня ХЛЕБ. У 4-х дзеях. Пачатак а 8 з пал. г. Білеты ў рабкасе, а ў дзень спэктаклю ў доме культуры з 5 гадз. Прымаюцца заяўкі на цэлевыя спэктаклі.

Кіно „Інтэрнацыянал" — З 13-га ліпеня замежны фільм Жонка статс-сакратара. Пачатак а 7 газзіне

Кіно „Пралетары" — З 16 ліпеня ВЯДОМЫ ФІЛЬМ МАСКА САРВАНА драма ў 7 частках. Пачатак а 2, 3-45, 8-45 і 10-30 г.

„Чырвоная Зорка" — ПЕРШЫ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ПУЦЁЎКА У ЖЫЦЬЦЁ. Драма ў 34 эпізодах

БЕЛАРУСКІ Дзяржаўны Інстытут Спажывецкай Каапэрацыі (арганізаваны на базе каапэрацыйнага аддз. Наркамсабу БДУ) АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ ПРЫЁМ на 1-шы асноўны курс:

на эканамічна-плянавае аддзяленьне . . . 30 чал.
„ таваразнаўчае . . . 30 „
і на падрыхтоўчыя 6-цімесячныя курсы . . . 80 „

Інстытут рыхтуе эканамістаў-плянавікоў вышэйшай кваліфікацыі да ўсіх відаў эканамічна-плянавай работы спажывецкай каапэрацыі і яе аб'яднаньняў, эканамістаў-тавараведаў для вышэйадзначанай сыстэмы.

На асноўны курс без іспытаў прымаюцца: асобы скончыўшыя курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ, тэхнікумы, 9-годкі, ФЗВ, прафшколы і агульнаадукацыйныя курсы на базе 7-годкі і інш. роўнапалежныя ўстановы.

Усе іншыя павінны трымаць іспыты ў абёме велаў рабфаку па грамадазнаўству, матэматыцы, фізыцы, прыродазнаўству і беларускай і расійскай літаратуры.

На падрыхтоўчыя курсы прымаюцца скончыўшыя 7-годкі і іншыя раўнапалежныя вучэбныя ўстановы і практычныя працаўнікі спажыўкаапэрацыі маючыя веды ў абёме 7-годкі.

Асобы жадаючыя паступіць у інстытут павінны падаць заяву з паказаньнем аддзяленьня і далучыць наступныя дакументы:

а) аб узросьце, б) аб адносінах да вайсковай павінасьці, (адбітак) в) аб адукацыі, г) аа стане здароўя, д) аб сацыяльным і матэрыяльным становішчы паступаючага і яго бацькоў, е) аб выбарчых правах паступаючага і яго бацькоў, ж) для калгаснікаў—спраўку ад калгаса, а для адпасобнікаў—адпаведны дакумент аб сельска-гаспадарчым падатку на 1931 г., з) асобы скончыўшыя тэхнікумы і прафшколы даведку аб 2-хгадовым практычным стажу, к) анкету засьведчаную прафсаюзнымі і савецкімі органамі і ўстановамі раённага маштабу, л) дзьве фотаграфічныя карткі і м) на 30 к. паштовых марак для адказу.

Узрост паступаючых ад 17 да 35 год.

Заявы з дакумантамі накіроўваць па адрасу: г. Менск, Савецкая, 43 Белкаапсаюз сэктар кадраў.

Прыём заяў да 25 жніўня. Іспыты з 25 па 30 жніўня.

Дырэктар Інстытуту

БЕЛКАНТОРА ДЗЯРЖБАНКУ апавяшчае сваіх кліентаў, ШТО Ў СУВЯЗІ З ЛІКВІДАЦЫЯЙ РАЁНАЎ ЛІКВІДУЮЦЦА наступныя 23 нашыя філіялы

1. Боркавіцкі
2. Ветрынскі
3. Вульскі
4. Межынскі
5. Высачанскі
6. Багушэўскі
7. Чаўсійскі
8. Халопеніцкі
9. Ляпянянскі
10. Коханаўскі
11. Кругляанскі
12. Копыскі
13. Дрыбінскі
14. Расьнянскі
15. Чаўсвіцкі
16. Сьвіслацкі
17. Сьчілавіцкі
18. Грэскі
19. Журавінкі
20. Хоцімскі
21. Юравіцкі
22. Капаткевіцкі
23. Азярыцкі

Таму ўсе рэестры і рахункі павінны накіроўвацца ў тыя раённыя філіялы, да яхіх далучаны тэрыторыі ліквідуемых раёнаў

УСЕБЕЛКАНТОРА ДЗЯРЖБАНКУ

З 1-VII 1931 г. Беларускае Аддзяленьне Трэсту „ПРАМВЭНТЫЛЯЦЫЯ" ПЕРАЙМЕНАВАНА Ў БЕЛАРУСКУЮ КАНТОРУ 2-га САНТЭХБУДУ, З ФУНКЦЫЯМІ выкананьня работ па цэнтральным ацяпленьні, вэнтыляцыі, цяплафікацыі, унутраных вадаправодах, каналізацыі, газаправодзе і вадастоках прамысловых прадпрыемстваў. Зьмяшчаецца на Комсамольскай, 17-10. Тэл.: 14-98, 12-17. БЕЛКАНТОРА

Гнаць такіх з каапэрацыі

У 1929 годзе у часе чысткі саваапарату, у вёсцы В. Гарадзяцічах (Любаньскага раёну) працаваў крамнікам Мнушкін Іцка, які ў часе бандытызму садзейнічаў разьвіцьцю апошняга: выяўляў яўрэяў і накіроўваў да іх бандытаў, дзякуючы чаму ў гэтай вёсцы ў 1920 г. было забіта 65 яўрэяў.

Пры чысткі Мнушкін быў вычышчан па 1-й катэгорыі, бо факты бандытызму і спэкуляцыі падцьвердзіліся.

Трэба гнаць вон з каапэрацыі такіх работнікаў.

Н. Вальсамакін.

КОШТ публікацыі аб згубе 1 дакуманту 1 р.

ЗГУБЛЕНЫ:

Вайсковая кніжка, выдан. Чэрвеньскім ваенкаматам на імя Федарынчыка М. Р., квіт. 360-п.

Паявы квіт на суму 6 руб. на імя Новік А., квіт. 361-п.

Пашпарт за № 32 ад 1-IX бяэтэрміновы, выд. Журавіцкім адм. аддз. на імя Глумакова Р. І., квіт. 362-п.

Мэтрыка [illegible] № 63 [illegible] 1910 [illegible] імя [illegible] квіт. 363-п.

Вайковы білет [illegible] РВК на імя Сем[illegible] квіт. [illegible]

Вайковая [illegible] М. Я., квіт. 365-п.

Вайковы білет [illegible] да Е., квіт. 369-п.

Паявая кніжка № 1218, выд. Азарыцкім каапэр. на імя Шаблінскага [illegible], квіт. 368-п.

Мэтрычныя выпіскі, выд Любаўскай [illegible] на імя Радзеўскага Л. К., квіт. 370-п.

Паявая кніжка № 883 на імя Праховіча, квіт. 379-п.

Даведка, выд. краўн. Белдрэс на імя Кука Б. Г., квіт. 383-п.

Вучотна-конская кніжка, выд. Каралінскім вайсковым сталом на імя Вдасенка А. Я., квіт. 371-п.

Лічная кніжка № 23, конская кніжка № 2162 і каапэрацыйная кніж. № 1148 на імя Старавойтава Ф., квіт. 372-п.

Пасьведчаньне, выд. Азарыцкім РВК на імя Варанчука Т., квіт. 377-п.

Сяброўскі білет саюзу будаўнікоў № 46138 Кукса Барыса, квіт. 383-п.

Вайковы білет, выд. Капыльскім РВК, нараджн. 1895 г. на імя Дамарыцкага В. А., квіт. 373-п.

Пасьведчаньне аб скончэньні Шаркай сямігодкі на імя Гайдукевіча С. С., квіт. 378-п.

Пячаткі калгасу «Шлях да пабеды», Стрэшын, Жлобінскага р., квіт. 381-п.

Паявая кніжка № 3669, выд. Бярэзінскім спажыв. таварыствам на імя Жукоўскай Н. Т., квіт. 382-п.

Сяброўскі білет саюзу будаўнікоў на імя Міхельсона В., квіт. 383-п.

Асабовая картка, выд. Баранскім РВК на імя Міхельсона В., квіт. 383-п.

Хлебная картка, выд. асабовым сталом Белдрэса на імя Гальшакова Кр., квіт. 383-п.

Хлебная картка, выдан. асабовым сталом Белдрэса, маг. 18 на імя Куракленка Н., квіт. 383-п.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара—7-69, сакратара—4-78, сэктараў—6-15. Выдавецтва—2-44.
падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў—5 р., на год—12 руб.

Глаўлітбел № 598

Друкарня імя СТАЛІНА

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ